ЯК ПРАЦУЕ АНКАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА? 7

СВЯТА БЕЗ ЛІШНІХ КІЛАГРАМАЎ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 СНЕЖНЯ 2020 г. СЕРАДА № 254 (29368)

Снег у Беларусі ёсць!

Фота БелТА.

Віцебск, канец снежня 2020-га.

ЦЫТАТА ДНЯ

Надзея ЕРМАКОВА, член Савета старэйшын пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі:

«Я хачу сказаць з жыццёвага вопыту: хацелася б, каб Усебеларускі народны сход прыняў рашэнні, якія потым будуць рэалізоўвацца ў жыцці. Шмат прапаноў ужо выказана, і добра, што дзейнічаюць дыялогавыя пляцоўкі, дзе можна агучыць тое, што думаеш. Канешне, усё не можа быць прынята ў тым выглядзе, як выказана. Таму што жыццёвую пазіцыю прапісаць у закон не заўсёды проста. Самае галоўнае, што патрэбна прапісаць, — якім шляхам мы захаваем мір і адзінства ў нашай краіне. Гэтыя пытанні самыя галоўныя, усё астатняе ў краіне ёсць».

КАРАТКА

- Беларускія кардыяхірургі выканалі найскладанейшую аперацыю нованароджанай вагой менш за 1,5 кг.
- **Памёр заслужаны артыст БССР Уладзіслаў Уласаў. Ён больш як паўстагоддзя аддаў сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, сыграў больш чым 100 роляў.**

- У Беларусі газіфікаваны ўсе гарадскія пасёлкі.
- **Дні адчыненых дзвярэй у БДПУ адбудуцца анлайн.**
- Беларусь атрымае $20 млн ад Фонду АПЕК для аховы здароўя.

ISSN 1990 — 763X

Камунальныя стасункі

Уцяпліцца, каб не журыцца

Эксперты пра ўменне дамаўляцца і разам сачыць за якасцю жылля

Камунальна-жыллёвая гаспадарка краіны — адна з самых галоўных галін, якія датычацца ўмоў жыцця чалавека, і менавіта яна прымае большасць нараканняў, калі гэтыя ўмовы не вытрымліваюцца. Супрацоўніцтва дзяржавы і ўласнікаў нерухомасці ў доглядзе жылля дагэтуль застаецца невысокім, хоць пэўныя захады ў Беларусі дзеля гэтага робяцца. У студзені 2020 года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, у ліпені — новая рэдакцыя Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП)». На працягу года дзейнічае Указ Прэзідэнта № 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў» з удзелам уласнікаў жылля. Карэспандэнт «Звязды» разам з экспертамі паспрабавала падсумаваць вынікі бягучага года па энергаэфектыўных мерапрыемствах і крыху зазірнуць у 2021-ы. СТАР. 6

Прыкметы часу

СУСТРАКАЕМ НОВЫ ГОД ЭКАЛАГІЧНА

Як зрабіць гэта свята не толькі прыемным, але і няшкодным для прыроды?

Зусім хутка наступіць галоўная ноч года. Хтосьці пачынае рыхтавацца да яе загадзя, а хтосьці ўсё пакідае на апошнія дні. Але і ў адным, і ў другім выпадку сваімі дзеяннямі можна як дапамагчы, так і нашкодзіць навакольнаму асяроддзю. СТАР. 8

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

«Найлепшае пацвярджэнне слоў пра чалавека як пра галоўнае багацце краіны»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка напрыканцы года ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды

«Сёння мы ўшаноўваем работнікаў прамысловасці, медыкаў, педагогаў, праваахоўнікаў, артыстаў, трэнераў, спартсменаў, святароў — усіх тых, хто сваёй штодзённай стваральнай працай робіць родную Беларусь больш моцнай і багатай, — вітаў удзельнікаў урачыстасці Аляксандр Лукашэнка. — Новы год традыцыйна звязаны з надзеямі на будучыню, чаканнямі цудаў і падарункаў. Нават мы, дарослыя, чакаем гэтыя цуды. Высокія заслужаныя ўзнагароды і ганаровыя званні — гэта таксама падарунак вам, вашым працоўным калектывам, родным, знак прызнання заслуг перад дзяржавай».

Так, ордэна Айчыны ўдастоены выдатны хірург — дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо, адзначыў Прэзідэнт. Распрацоўкі сусветнага ўзроўню ў нелінейнай оптыцы і лазернай фізіцы на рахунку акадэміка і зараз ужо заслужанага дзеяча навукі Мікалая Казака.

«Фактычна з нуля стварыў паспяховае інавацыйнае прадпрыемства Аляксандр Бадзяка, за што па праве яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Вельмі важна, што мы навучыліся ўжываць найноўшыя тэхналогіі. Удвая больш каштоўна, што мы навучыліся ствараць гэтыя тэхналогіі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Паспяховая гісторыя кожнага з вас — найлепшае пацвярджэнне маіх слоў пра чалавека як пра галоўнае багацце краіны».

Сярод узнагароджаных больш за ўсё педагогаў, адзначыў беларускі лідар, падкрэсліўшы: «Гэта людзі, чыя роля ў грамадстве несувымерна высокая».

Гонар і хвала медыкам, дадаў Прэзідэнт і паўтарыў, што да іх сёння прыкавана асаблівая ўвага — так распарадзіўся час.

«Перакананы, вы паспяхова справіцеся са сваімі задачамі. Як і аграрыі, якія паказалі ўсім нам узор прафесіяналізму і працавітасці, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Душу народа і традыцыі захоўваюць і ўзбагачаюць майстры мастацтваў, выхоўваюць у людзях чалавечнасць і высакароднасць».

Ён адзначыў заслугі сілавікоў і ваенных, якія абараняюць правапарадак, бяспеку і суверэнітэт, спартсменаў і трэнераў, якія сваімі перамогамі ўслаўляюць краіну.

«Усе вы, хто прысутнічае тут, — яркія асобы, якія адбыліся, паспяховыя людзі і прыклад для іншых», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Ён павіншаваў прысутных з заслужанымі ўзнагародамі, надыходзячымі святамі і пажадаў цяпла, утульнасці і радасці ў кожным доме.

СЛОВА ЎЗНАГАРОДЖАНЫМ

Ніна ДЗЬЯЧЭНКА, выкладчыца народна-сцэнічнага танца Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа, атрымала званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў».

«Усё маё жыццё прысвечана балету, — расказала яна журналісту «Звязды». — Сёння я педагог нашага вядучага харэаграфічнага каледжа. І вось мяне ўзнагароджваюць такой вялікай узнагародай, высокай. Гэта нават сюрпрыз для мяне.

Балет — маё жыццё. Я ў ім з пяці гадоў. У мінулым — оперны тэатр, музычны тэатр, дзе я працавала. Зараз у каледжы я стаўлю спектаклі, вяду асноўныя прадметы: народна-сцэнічны танец, характарны танец, беларускі танец.

Выпускнікі адлятаюць ад нас, мы ўкладаем у іх усю душу, і за кожнага яна баліць і хвалюецца. Мы вучым нашых выхаванцаў любіць радзіму. Кажам, што Беларусь — гэта месца, дзе жыць нам і нашым дзецям, наступным пакаленням, таму мы павінны навучыцца нешта ад сябе аддаваць ёй, а не толькі браць».

Намеснік Генеральнага пракурора Генадзь ДЫСКО атрымаў ганаровае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь»:

«Я ўжо працую больш за 30 гадоў у пракуратуры, таму, спадзяюся, унёс пэўны ўклад у дасягненне тых вынікаў, якія сёння маем у барацьбе са злачыннасцю, і ў заканатворчасць. Зараз мне ў Генеральнай пракуратуры падпарадкавана структурнае падраздзяленне, якое працуе менавіта ў сферы заканатворчасці.

Самыя галоўныя якасці, якія павінны быць у пракурора, — сумленнасць і прыстойнасць. Мы, юрысты, працуем з людзьмі, а людзі — вельмі далікатны матэрыял, таму любая фальш заўсёды будзе імі заўважаная.

У новым годзе ўсім жадаю здароўя. Сам толькі што перахварэў на ковід, гэта цяжкая хвароба. Яшчэ — удачы і аптымізму. Усё ў нас будзе добра!»

Мікалай БАРЫСЕНКА, гісторык, ваенны пісьменнік, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру», атрымаў з рук кіраўніка дзяржавы ордэн Францыска Скарыны:

«Большую частку жыцця я прысвяціў вывучэнню гісторыі і культуры Магілёўскай вобласці, а калі шырэй — усходняй Беларусі, — расказаў ён. — У мяне выйшла каля 20 кніг гісторыка-краязнаўчай накіраванасці. Паралельна ўжо 26 гадоў займаюся пошукавай работай. За час дзейнасці гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» ўстаноўлена 26 тысяч імёнаў байцоў, якія лічыліся раней зніклымі без вестак, на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Паведамілі сваякам, калі такіх знайшлі, унеслі ў базу даных. З зямлі разам з 52-м пошукавым батальёнам падняты 1410 байцоў і камандзіраў, з іх установлены 90 імёнаў.

Удзел у нашай рабоце дзяцей і моладзі — самае моцнае патрыятычнае выхаванне. Бо гэта дазваляе літаральна дакрануцца да таго, пра што пішуць у кнігах і здымаюць у кіно. Такое судакрананне пакідае незабыўны след і нараджае вельмі моцныя і добрыя пачуцці».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Незабыўныя эмоцыі і адказнасць за будучыню

Праз гадзіну пасля пачатку цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод у Палацы Незалежнасці распачаўся Беларускі навагодні баль для моладзі.

Яго ўдзельнікі — больш за тры сотні студэнтаў і навучэнцаў з самых розных навучальных устаноў краіны. Гэта стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскіх, дыпламанты міжнародных конкурсаў і навукова-практычных канферэнцый, уладальнікі высокіх тытулаў, удзельнікі студэнцкіх будаўнічых атрадаў, чэмпіёны па спартыўна-бальных танцах, майстры спорту і іншыя маладыя людзі.

«Сёння тут, у Палацы Незалежнасці, заўсёды такім стрыманым і афіцыйным, ажывае гісторыя, — звярнуўся да іх Аляксандр Лукашэнка. — Гісторыя Беларусі, якая багатая на ўнікальныя і прыгожыя традыцыі».

Звяртаючыся да моладзі, Прэзідэнт сказаў: «Я веру ў вас. Так, мы перажываем няпростыя часы. Так, часам у авангардзе падзей — юныя і гарачыя галовы. Вашы галовы. Так было заўсёды: і ў мае часы, і пазней. Але перакананы: рана ці позна ўсе нашы дзеці пачуюць не заклікі замежных тэлеграм-каналаў, а голас розуму. І скажуць дзякуй тым людзям, якія сёння ваююць за будучыню».

На долю пакалення стваральнікаў незалежнай Беларусі выпала гістарычная місія служыць сваёй краіне, каб захаваць яе для наступнага пакалення, падкрэсліў беларускі лідар. Ён выказаў упэўненасць, што ўдзелам у гэтым балі маладыя людзі будуць ганарыцца ўсё жыццё, і заклікаў зрабіць больш памятных фота для будучых дзяцей і ўнукаў.

Прэзідэнт пажадаў незабыўных эмоцый, пачуцця дачынення да спадчыны беларускай гісторыі і адказнасці за будучыню Айчыны. А яшчэ — заставацца прыгожымі не толькі знешне, але і духоўна.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто працаваў над стварэннем бальнай атмасферы, павіншаваў усіх з надыходзячымі навагоднімі святамі.

«Няхай усе вашы мары здзейсняцца, а наша любімая Беларусь дзякуючы вашым поспехам і дасягненням стане яшчэ мацнейшай і больш прыгожай», — рэзюмаваў ён.

І яшчэ некалькі слоў ад Прэзідэнта ў адрас, напэўна, не толькі моладзі: «Трэба ўсё рабіць сваімі рукамі, калі мы можам. А мы можам усё».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фотарэпартаж з балю — ужо цяпер на сайце zviazda.by і ў заўтрашнім пераднавагоднім нумары.

Нашы дзеці

ПА ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ

«Нашы дзеці» — вельмі добрая традыцыя, якая стала брэндам краіны. Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка пасля навагодняга свята, якое стала часткай рэспубліканскай акцыі, у Бягомльскай дапаможнай школе-інтэрнаце, паведаміла БелТА.

Фота БелТА.

Асабіста ён ужо больш за 10 гадоў прыязджае ў госці да выхаванцаў гэтай установы. «Тут пражываюць 96 хлопчыкаў і дзяўчынак. Гэта дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апякунства бацькоў. З боку дзяржавы ім удзяляецца вялікая ўвага па ўсіх кірунках: у пытаннях пражывання, адукацыі, выхавання», — адзначыў спікер ніжняй палаты парламента.

Віншуючы дзяцей з надыходзячымі святамі, Уладзімір Андрэйчанка пажадаў, каб іх жаданні здзейсніліся. «Новы год сустракаем з надзеяй на цуд. Хацелася б, каб 2021-ы быў годам стварэння, аб'яднання, міру і спакою», — адзначыў ён і падзякаваў педагогам за працу.

❍ ТЫМ ЧАСАМ

У час Усебеларускага народнага сходу трэба даць адказ на чаканні людзей. Аб гэтым заявіў Уладзімір Андрэйчанка. Спікер ніжняй палаты парламента адзначыў, што форум стане важнай падзеяй у жыцці краіны. «На Усебеларускі народны сход павінны быць дэлегаваны ўсе слаі нашага грамадства. Пра гэта ўчора максімальна выразна было сказана Прэзідэнтам. Гэта інтэлігенцыя, работнікі сельскай гаспадаркі, прамысловасці, органаў дзяржаўнага кіравання. Сход будзе вызначаць палітыку дзяржавы на найбліжэйшыя пяць гадоў. Таксама разгледзяць пытанні далейшага развіцця грамадска-палітычнага ладу краіны. Думаю, гэта вельмі важна, людзі ўскладаюць на Усебеларускі народны сход вельмі вялікія надзеі», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўрапарламент ратыфікуе пагадненні па брэксіту ў сакавіку

Пра гэта паведамляецца ў распаўсюджанай сумеснай заяве кіраўнікоў вядучых фракцый Еўрапарламента. «Старшыні фракцый прынялі рашэнне разгледзець з Саветам ЕС і Еўракамісіяй прапанову крыху падоўжыць перыяд часовага ўжывання пагаднення, што дазволіць правесці ратыфікацыю [дакументаў] Еўрапарламентам на пленарнай сесіі ў сакавіку», — адзначаецца ў дакуменце. Брусель і Лондан дасягнулі кампрамісу па тэксце пагаднення аб партнёрстве пасля брэксіту. Па словах галоўнага перагаворшчыка ЕС па Brexit Мішэля Барнье, пагадненне прадугледжвае свабодны гандаль без квот і тарыфаў, неабмежаваны доступ да тэрыторыі, марской і паветранай прасторы адзін аднаго і збалансаваны доступ да марскіх рэсурсаў. Бакі маюць намер забяспечыць сваім грамадзянам аднолькавы доступ да сацыяльных сістэм. Брусель і Лондан адмовіліся ад каардынацыі дзеянняў у сферы знешняй палітыкі, санкцыйных рэжымаў і абароны.

У САЗ спрагназавалі з'яўленне новых мутацый каранавіруса

З'яўленне новых штамаў ковіда стане выклікам для свету ў надыходзячым 2021-м годзе, заявіў гендырэктар САЗ Тэдрас Гебрэесус. Ён папрасіў краіны, у якіх выявяць мутацыі, аператыўна інфармаваць пра гэта арганізацыю і іншыя дзяржавы. Пакуль, па словах Гэбрэесуса, навукоўцы толькі спрабуюць зразумець, як змены ў каранавірусе ўплываюць на яго здольнасць распаўсюджвацца і на цяжкасць захворвання COVID-19. Ён таксама падзякаваў Вялікабрытаніі і ПАР за «тэсціраванне і выяўленне новых разнавіднасцяў». Далейшая мутацыя віруса непазбежная, бо гэта закладзена ў яго прыродзе, адзначыў РІА «Навіны» загадчык сектара малекулярнай эвалюцыі Інстытута праблем перадачы інфармацыі РАН, прафесар Сколкаўскага інстытута навукі і тэхналогій Георгій Базыкін. Ён перакананы: каб спыніць каранавірус новага тыпу, чалавецтву неабходная масавая вакцынацыя.

У Ізраілі ідэнтыфікавалі 350-тысячагадовы шліфавальны інструмент

Найстаражытнейшую шліфавальную прыладу працы выявілі спецыялісты Хайфскага ўніверсітэта. Яны падрабязна апісалі знаходку ў артыкуле часопіса Journal of Human Evolution. Круглы даламітавы камень з мікраскапічнымі слядамі шліфоўкі археолагі знайшлі яшчэ ў 1960-х у пячоры Табун на гары Кармэль. Яна была населена ў перыяд ніжняга і сярэдняга палеаліту (500—40 тысяч гадоў таму). Зараз навукоўцы заняліся паўторным датаваннем знаходак. За дзесяцігоддзі яго метады значна палепшыліся. Так, ім удалося выявіць узрост шліфавальнага каменя — 350 тысяч гадоў. Раней лічылася, што такія прылады пачалі выкарыстоўвацца каля 200 тысяч гадоў таму.

На карысць дзяржаве: вопыт і веды былых парламентарыяў яшчэ спатрэбяцца

У Савеце Рэспублікі ўпершыню абралі Савет старэйшын. Новая інстытуцыя будзе дзейнічаць пры Прэзідыуме і выступаць у якасці дарадчага органа.

Як адзначыла на сустрэчы са сваімі сталымі калегамі **спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА,** ініцыятыва стварыць савет з мудрых і паважаных парламентарыяў узнікла невыпадкова — вопыт і школа парламентарызму гэтых людзей яшчэ могуць прынесці плён краіне. Яна звярнула ўвагу, што сёння ёсць патрэба ў абмеркаванні пытанняў з тымі людзьмі, што ведаюць, разумеюць, бачаць сітуацыю, якая складваецца ў грамадстве. З пункту гледжання старшыні Савета Рэспублікі, гаворка датычыцца пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця, жыццядзейнасці краіны, таму вопыт і веды сталага пакалення, безумоўна, патрэбныя.

Наталля Качанава перакананая, што погляд збоку вельмі важны для прыняцця рашэнняў, бо іх не заўсёды можна ацаніць аб'ектыўна, таму вопыт і веды папярэднікаў цяперашняму пакаленню парламентарыяў вельмі неабходныя.

Яна выказала ўпэўненасць, што сустрэчы будуць праходзіць на сістэмнай аснове і ўзаемадзеянне стане плённым.

Адзначым, што ў склад савета старэйшын увайшлі два былыя старшыні Савета Рэспублікі чацвёртага і пятага скліканняў — Барыс БАТУРА і Анатоль РУБІНАЎ; старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні пятага склікання і намеснік гэтай профільнай камісіі ў шостым скліканні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ; намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах (трэцяга і чацвёртага скліканняў), член гэтай Пастаяннай камісіі ў першым і другім скліканнях Надзея ЕРМАКОВА; старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці чацвёртага склікання Антаніна МОРАВА; старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве пятага склікання, намеснік старшыні гэтай профільнай камісіі чацвёртага склікання Лілія МАРОЗ; старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы шостага склікання Сяргей РАХМАНАЎ і яго калега па пятым скліканні Уладзімір СЯНЬКО, а таксама намеснік старшыні Савета Рэспублікі пятага склікання Анатоль РУСЕЦКІ.

Трэба сказаць, што дзяліцца вопытам і ведамі гэтыя паважаныя і вопытныя людзі будуць на грамадскіх пачатках, а іх рашэнні будуць насіць рэкамендацыйны характар.

Як растлумачыла ў размове з журналістамі Надзея ЕРМАКОВА, сама назва новага інстытута — Савет старэйшын — сведчыць аб тым, што ў яго членаў ёсць пэўны жыццёвы досвед:

— З часам разумееш, як павінна быць. Адразу падаецца, што павінна быць толькі так, а не інакш, але калі паразважаеш і ўбачыш па жыцці, то вопыт старэйшага пакалення вельмі патрэбны моладзі. Гэта, напэўна, самая галоўная місія, — пераканана яна. — Наша задача — не перашкаджаць, але дзесьці падказаць, якім чынам можна зрабіць.

На думку Сяргея РАХМАНАВА, неабходна максімальна прыцягваць у арбіту палітычнага і эканамічнага жыцця людзей, якія маюць вопыт, умацоўваць аналітычны складнік, выпрацоўваць пэўныя рэкамендацыі.

— Сітуацыя ў свеце вельмі складаная, яна ўплывае і на Беларусь. І мы павінны ўсе рэсурсы, у тым ліку і інтэлектуальныя, выкарыстоўваць для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць, — пераканаты ён. — Таму патрэбна цесна ўзаемадзейнічаць з калегамі, у тым ліку з Расійскай Федэрацыі і іншых краін, каб знаходзіць рашэнні, якія дапамогуць прайсці гэтую складаную паласу па аптымальным шляху.

Ён звяртае ўвагу, што сітуацыя звязана не толькі з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі, але і з сусветным эканамічным і палітычным крызісам.

— Паколькі наша краіна з адкрытай эканомікай — нас гэта закранае непасрэдна і неабходна дзейнічаць так, каб вывесці рэсурсы максімальна на паверхню і выкарыстаць на карысць дзяржавы і грамадзян, — падкрэсліў ён у размове з журналістамі. — Патэнцыял у нас ёсць. Таму сэнс дзейнасці Савета старэйшын, як мне падаецца, — ва ўзмацненні аналітычнай работы, прычым не толькі на бягучы момант, але і на перспектыву.

Сяргей Рахманаў акцэнтаваў увагу на неабходнасці бачання адпаведнай стратэгіі не толькі па краіне, але і па галінах, рэгіёнах, каб можна было прадставіць вобраз будучага і людзі разумелі, што трэба рабіць усім, каб гэты вобраз быў рэалізаваны на практыцы.

У канцы адзначым, што Савет старэйшын на першым сваім пасяджэнні абраў свайго кіраўніка — дарадчы орган узначаліў Барыс Батура.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.

Слова — чытачам

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

«Газеты для мяне па-ранейшаму на першым месцы...»

Старшыня СВК «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна Аляксандр БАГЕЛЬ:

— Мы выпісваем шмат газет на ўсе нашы падраздзяленні, у тым ліку і «Звязду». Асабіста мне цікава прачытаць у першую чаргу пра тых, каго я ведаю, пра свой калектыў, пра суседзяў, калег. Дзякуючы газетам і часопісам даведваюся, як працуюць іншыя гаспадаркі, чым яны ганарацца, што можна ў іх пераняць. Нельга варыцца ва ўласным соку, трэба ведаць, што адбываецца ў свеце. У рэспубліканскіх выданнях чытаю палітычныя навіны, цікаўлюся, што адбываецца ў краіне і далёкім замежжы. На першым месцы інфармацыя, якая датычыцца непасрэдна нашай галіны і палітыкі, але заўсёды з задавальненнем праглядаю актуальныя матэрыялы па культуры, медыцыне. Чытаю пра дасягненні нашых спартсменаў, пра тое, як развіваецца айчынны спорт. Канешне, інтэрнэт сёння займае шмат прасторы, але газеты, лічу, як былі на першым месцы, так і застаюцца. Гэта асабіста маё меркаванне. Мне падабаецца не сціслая канстатацыя факта, а аналітыка. І ніколі не абмяжоўваюся адной газетай. Нават пра адно і тое ж розныя выданні пішуць па-свойму. У кожнай газеты свае рубрыкі, свой падыход да падрыхтоўкі матэрыялу. Да нас даволі часта прыязджаюць журналісты з газет і тэлебачання. Сёлета, напрыклад, мы ўпершыню вырошчвалі кавуны, і гэтая навіна хутка распаўсюдзілася па інфармацыйных каналах. Летась мы пабудавалі сучасную ферму побач з нашымі біягазавымі ўстаноўкамі — МТК «Мышкавічы». Зараз гэты комплекс дае вельмі добрую аддачу. Гэта ферма выклікае цікавасць шмат у каго. Да нас прыязджалі па вопыт нават з заходніх абласцей. І гэта яшчэ адзін прыклад таго, як аператыўна працуюць нашы сродкі масавай інфармацыі. Мы сёння жывём у вельмі насычаны інфармацыйны час. З аднаго боку, гэта добра, бо ўсё, як той казаў, на паверхні, з іншага — патрабуе з большай адказнасцю ставіцца да таго, што чытаеш, каб не сказіць рэчаіснасць.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва СВК «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага.

Дыялогавая пляцоўка

У рэжыме адкрытага мікрафона

Два тэрміны прэзідэнцтва і змешаная выбарчая сістэма для парламента

Як прайшло абмеркаванне на дыялогавай пляцоўцы ў Савеце Рэспублікі па тэме змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Дыскусія разгарнулася вакол пакета ініцыятыў па плануемай канстытуцыйнай рэформе, якія прадставілі на разгляд экспертаў і грамадскасці студэнты юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта — актывісты пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў» «Маладзёжны сектар пры юрыдычным факультэце БДУ». І ўвогуле неабыякавыя да палітычных падзей у краіне маладыя людзі, якія ўжо зарэкамендавалі сябе ў вучобе і грамадскім жыцці. Ініцыятывы падрыхтавала каманда аднадумцаў, з вынікамі работы якой прысутных азнаёміла студэнтка другога курса Эліна Паўленка.

У ролі мадэратара дыялогавай пляцоўкі выступіў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Сяргей СІВЕЦ.** Паводле яго слоў, сёння вельмі важна паглядзець на Канстытуцыю вачыма маладой часткі грамадства. Бо менавіта ім жыць пры новым канстытуцыйна-прававым укладзе нашай дзяржавы. І, на думку Сяргея Сіўца, студэнты юрыдычнага факультэта падышлі да вывучэння пытання, як вопытныя хірургі, — не з сякерай, а са скальпелем. Іх ініцыятывы ўяўляюць сабой сур'ёзную прадметную аснову для грунтоўнага разгляду, яны захоўваюць стабільны характар нашага грамадскага ладу і ў той жа час могуць паслужыць базай для далейшага эвалюцыйнага развіцця, адзначыў сенатар.

Дык што прапаноўваюць маладыя? Напрыклад, замацаваць у рэфармаванай Канстытуцыі норму аб тым, што Прэзідэнт выбіраецца на пяць гадоў, а яго знаходжанне на чале дзяржавы абмежаваць да двух тэрмінаў. Таксама прапаноўваецца замацаваць у Канстытуцыі палажэнне аб тым, што кіраўнік краіны са згоды Палаты прадстаўнікоў прызначае прэм'ер-міністра, а той, у сваю чаргу, са згоды ніжняй палаты парламента вылучае сваіх намеснікаў і міністраў.

Палату прадстаўнікоў прапануецца фарміраваць па змешанай выбарчай сістэме: частку дэпутатаў — па мажарытарнай, частку — па прапарцыянальнай. Парламент надзяліць правам прызначаць рэферэндумы.

Таксама маладыя юрысты лічаць неабходным заканадаўча рэгламентаваць работу Усебеларускага народнага сходу. У прыватнасці, вызначыць перыяд яго правядзення і замацаваць дакладную колькасць дэлегатаў.

Прагучала прапанова заснаваць пасаду ўпаўнаважанага па правах чалавека. Прызначэнне на яе даручыць Палаце прадстаўнікоў са згоды Савета Рэспублікі.

Звяртае на сябе ўвагу і той факт, што, відаць, у перыяд падрыхтоўкі да Усебеларускага народнага сходу на запрашэнне да ўдзелу ў дыялогавай пляцоўцы ў Савеце Рэспублікі адгукнуліся беларускія парламентарыі, супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама, навукоўцы-юрысты, студэнты і выкладчыкі БДУ.

У дыскусіі ўзялі ўдзел і прадстаўнікі Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, што і зразумела, бо ў цэнтры ўвагі былі менавіта ініцыятывы маладых. На дыялогавай пляцоўцы прысутнічалі таксама прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, у прыватнасці Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады), партыі БНФ і грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэнне» і іншыя.

Невыпадкова Сяргей Сівец з задавальненнем канстатаваў, што экспертная супольнаць была прадстаўлена дастаткова шырока для паўнавартаснай размовы.

Леанід ТУГАРЫН.

На слыху

Вакцынацыя пачалася

Вакцына супраць каранавіруса «Спадарожнік V» дастаўлена ў Беларусь

Расійская вакцына «Спадарожнік V» паступіла ў Беларусь і з 29 снежня пачалася масавая вакцынацыя насельніцтва. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.

Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ адзначыў, што першымі будуць вакцынаваны медыцынскія работнікі, педагогі і тыя спецыялісты, якім з-за асаблівасцяў прафесіі даводзіцца шмат кантактаваць з людзьмі. Вакцынацыя будзе праводзіцца ў дабравольным парадку. У Беларусі створана сістэма захоўвання вакцыны, таксама закуплена спецыяльнае медыцынскае маразільнае абсталяванне, якое дазваляе транспартаваць вакцыну.

— Мы ўдзячныя расійскаму боку за актыўнае ўзаемадзеянне і стратэгічнае супрацоўніцтва ў вырашэнні гэтага пытання, — дадаў Дзмітрый Піневіч.

У сваю чаргу, **міністр аховы здароўя Расіі Міхаіл МУРАШКА** адзначыў, што хуткі доступ Беларусі да расійскай вакцыны стаў магчымым дзякуючы эфектыўнай рабоце беларускай рэгулятарнай сістэмы. Сыграў сваю ролю і рацыянальны падыход да лакальных клінічных выпрабаванняў вакцыны

— Пратакол праведзенага ў краіне клінічнага выпрабавання дазволіў у кароткія тэрміны пацвердзіць валіднасць шырокіх расійскіх даных клінічнага вывучэння «Спадарожніка V» для Беларусі, — адзначыў Міхаіл Мурашка.

Гендырэктар Расійскага фонду прамых інвестыцый (РФПІ) Кірыл Дзмітрыеў падкрэсліў, што Беларусь стала першай замежнай краінай, якая афіцыйна зарэгістравала расійскую вакцыну. А таксама першай краінай, дзе пачынаецца масавая вакцынацыя «Спадарожнікам V». Наступным этапам супрацоўніцтва мусіць стаць арганізацыя выпуску гатовай формы вакцыны ў Беларусі, што істотна спросціць лагістыку, дазволіць паскорыць тэмпы вакцынацыі, пашырыць прафілактыку захворвання.

Трэба адзначыць, што вакцынацыя ў Беларусі пачалася крыху раней, чым было запланавана: Дзмітрый Піневіч анансаваў яе пачатак у студзені 2021 года. Па яго словах, за першыя чатыры месяцы мяркуецца прышчапіць каля 1,2 мільёна беларусаў. Пасля трэба выйсці на паказчык у 5–5,5 мільёна. Усеагульнай вакцынацыі не прадугледжваецца з прычыны немэтазгоднасці і супрацьпаказанняў.

Алена КРАВЕЦ.

Без бар'ераў

Чым пахне зялёны?

Адказ на гэтае пытанне можна знайсці на незвычайнай выстаўцы «Шлях да колеру», што адкрылася ў сталічным Палацы мастацтваў. Упершыню тут выстаўляюцца карціны невідушчых мастакоў. Здавалася б, як чалавеку, які з нараджэння не мае зроку, працаваць з фарбамі? Але маладыя людзі даказваюць, што мастацтва можа быць даступнае для ўсіх.

САКРЭТЫ ЎСПРЫМАННЯ

Як памацаць жоўты колер? Які на смак чырвоны? Як гучыць зялёны? Калі вы паспрабуеце знайсці адказы на гэтыя пытанні, атрымаеце ключык да разумення незвычайных карцін. Маладыя мастакі праз свае работы перадаюць адчуванні. Жоўты — гэта цяпло сонечных прамянёў на скуры, пясок, што шамаціць пад нагамі. Чырвоны — можа нагадваць пра каханне, мужнасць, урачыстасць, быць салодкім ці вострым, альбо саланаватым, як кроў. Зялёны пахне скошанай травой, мятай, хвояй. Лёгка здагадацца, як выглядае карціна «Басанож». А як намаляваць дотык, сяброўства, спакой, характар, аблокі, душу? Усе гэтыя тэмы «пакладзены» на халсты. Гэтая выстаўка дапамагае зазірнуць углыб рэчаў, патрапіць у асаблівы свет уяўленняў і эмоцый. А для гледачоў гэта выдатная магчымасць па-іншаму ўбачыць свет. І, хто ведае, можа, менавіта з работ невідушчых мастакоў пачнуцца новыя гісторыі ў сучасным жывапісе?

Як правіла, для людзей, што ад нараджэння жывуць у цемры, назвы фарбаў — пустыя словы. Але толькі не для тых, хто пачынае маляваць. Для мастакоў колеры пахнуць, перацякаюць паміж пальцамі, адчуваюцца, гучаць. На кожную фарбу накладваюцца пэўныя асацыяцыі, якія могуць не супадаць у розных асоб.

Праект BelonicaArt пачаў працаваць на базе сталічнай спецыялізаванай школы № 188 для дзяцей з парушэннямі зроку. Яго куратары падказваюць невідушчым мастакам, як абыходзіцца з колерамі. У будучым плануецца стварыць арт-тэрыторыю, дзе невідушчыя людзі розных узростаў змогуць навучацца, сустракацца, эксперыментаваць, рэалізоўвацца праз жывапіс і, магчыма, такім чынам зарабляць. «Наш праект не пра тое, як сабрацца, каб цікава правесці час. Ён дае людзям магчымасць рэалізавацца, пашырае магчымасці ўспрымання навакольнага свету», — заўважае **заснавальніца праекта Ірына БАНДАРОВІЧ.**



Усё ж выбар прафесій для асоб з праблемамі зроку вельмі абмежаваны, а падобныя праекты дазваляюць сціраць межы і натхняюць на пошукі новых дарог, шанцаў, адкрыццяў.

З гэтых работ для невідушчых людзей пачынаецца шлях у краіну колераў. Падобных школ жывапісу для людзей, што не маюць зроку, у свеце яшчэ не было. Тут канцэнтруюцца абсалютна новыя ідэі, выпрацоўваюцца методыкі і вядуцца актыўныя пошукі інструментаў, якія дапамогуць невідушчым людзям паглыбіцца ў мастацтва.

У сваёй рабоце каманда выкарыстоўвае розныя прылады. Драўляная рамка з нацягнутай лескай дазваляе невідушчым мастакам арыентавацца на палатне. Клей ПВА, ніткі, пластык, малярная стужка дапамагаюць ствараць пэўныя межы, контуры, выстройваць фігуры і кампазіцыі. Колераві круг тут «перакладзены» для чытання» невідушчымі людзьмі — ён раздрукаваны аб'ёмным на 3D-прынтары. У ход ідуць элементы адзення, фрагменты тканіны, што для маладых мастакоў служаць не толькі фактурай, якую можна памацаць, але і часткай кампазіцыі.

ЧАРОЎНЫ ЛІХТАРЫК

Спецыяльна пад праект беларускія айцішнікі распрацавалі прыладу «Ліхтар», якая дазваляе невідушчым людзям распазнаваць колеры. Яна складаецца з датчыка колеру і мікракантролера, які апрацоўвае вымярэнні інтэнсіўнасці RGB-хваль. Пасля апрацоўкі «чароўны» ліхтарык «перакладае» колеры на мелодыі. Так людзі без зроку, якія не ведаюць фарбаў, пры дапамозе музыкі і асацыяцый уяўляюць колеры. На дадзены момант прылада тэсціруецца. З ёй якраз і працуюць удзельнікі першай у Беларусі мастацкай студыі для невідушчых. У будучым плануецца зрабіць «Ліхтар» даступным для ўсіх. Ужо сёння каманда BelonicaArt гатовая дзяліцца сваімі напрацоўкамі. Работы незвычайных мастакоў выкладваюцца ў сацыяльных сетках, і невідушчыя людзі вельмі чакаюць водгукаў, просяць, каб ім зачытвалі, якія думкі іх работы выклікаюць у людзей. Карціны асаблівых мастакоў можна набыць. Выручаныя грошы пойдуць на развіццё праекта.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Класныя навіны

Электронная платформа ў дапамогу педагогам

Ці заменіць яна рэальны навучальны працэс?

Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі запусцяць у тэставым рэжыме з 1 студзеня 2021 года. Пра гэта паведаміла падчас круглага стала ў БелТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА.

МЕТАДЫЧНАЯ ПАДТРЫМКА

— Настаўнікі актыўна выкарыстоўваюць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на працягу шэрагу гадоў як у час правядзення ўрокаў, так і для арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў. На нацыянальным адукацыйным партале размешчана інфармацыя аб інтэрнэт-сэрвісах, якія можна выкарыстоўваць для арганізацыі адукацыйнага працэсу. Выкарыстанне ІКТ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі дазволіла ва ўмовах няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі забяспечыць навучанне ўсіх школьнікаў у IV чвэрці з наступнай іх атэстацыяй па выніках 2019/2020 навучальнага года, — расказала Ірына Каржова. — Разам з тым педагагічная грамадскасць разумее, што ва ўмовах актыўнай лічбавізацыі ўсіх працэсаў сістэма адукацыі не можа стаяць на месцы і быць задаволенай наяўнымі напрацоўкамі. Рэаліі часу вымусілі нас паскорыцца, і яшчэ вясной было прынята рашэнне аб стварэнні адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурсу для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Плануецца, што платформа пачне працаваць у тэставым рэжыме з 1 студзеня 2021 года. Але інфармацыйна-адукацыйны рэсурс не заменіць рэальны навучальны працэс у школе. Ён дапоўніць працэс вывучэння прадметаў і стане метадычнай падтрымкай для навучання тых дзяцей, якія па нейкіх прычынах часова не могуць наведваць установу адукацыі альбо маюць патрэбу ў дадатковым тлумачэнні падчас выканання хатніх заданняў.

Рэсурс уключае пералік навучальных матэрыялаў, а таксама розныя сэрвісы для арганізацыі і кіравання адукацыйным працэсам (электронны дзённік, журнал, камунікацыю ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу і г. д.).

«Стварэнню платформы папярэднічала вывучэнне айчыннага вопыту і вопыту іншых краін. Да распрацоўкі адукацыйнага кантэнту былі запрошаны найлепшыя настаўнікі з усіх рэгіёнаў краіны. У абласцях створаны творчыя групы, у склад якіх увайшлі ў першую чаргу настаўнікі-метадысты, настаўнікі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, педагогі — аўтары навучальных дапаможнікаў, якія маюць вопыт стварэння электронных адукацыйных рэсурсаў. У работу ўключыліся ўдзельнікі рэспубліканскага клуба «Крышталь журавель». Распрацоўку адукацыйнага кантэнту каардынуюць рэгіянальныя інстытуты развіцця адукацыі. Падрыхтаваныя навучальныя матэрыялы прайшлі метадычную экспертызу ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце», — дадала Ірына Каржова.

НАПАЎНЕННЕ РЭСУРСУ

— Адзін з элементаў інфармацыйна-адукацыйнага рэсурсу, які цяпер распрацоўваецца, — бібліятэка навучальных матэрыялаў. Яна структураваная па вучэбных прадметах, па класах і модулях, сфарміраваных на аснове навучальных праграм. Усе матэрыялы будуць адпавядаць адукацыйным стандартам агульнай сярэдняй адукацыі і вучэбным праграмам, зацверджаным Міністэрствам адукацыі, — паведаміла **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.** — Бібліятэка навучальных матэрыялаў уключае некалькі падраздзелаў. У кожным модулі будзе абавязковая спасылка на параграф навучальнага дапаможніка, на падставе якога ён распрацаваны. У кожным модулі ёсць раздзел, які арыентуе навучэнцаў на вынікі вывучэння новай тэмы. Будуць пералічаны веды і ўменні, прадугледжаныя вучэбнай праграмай, якія неабходна засвоіць падчас вывучэння новай тэмы. Абавязковая наяўнасць відэаролікаў з тлумачэннем новага навучальнага матэрыялу. Школьнікам прапануюць тэставыя заданні для самакантролю ведаў і ўменняў. Прадугледжана рубрыка «Дадатковыя матэрыялы», якая будзе напаўняцца паступова. Мы плануем, што ў яе ўключацца ў тым ліку метадычныя напрацоўкі педагогаў, электронныя адукацыйныя рэсурсы. Сёння мы акумулюем усе тыя распрацоўкі, якія ўжо існуюць.

МАГЧЫМАСЦЬ ДЫСТАНЦЫЙНЫХ ЗАНЯТКАЎ

— Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе мець высокі ўзровень абароны інфармацыі, — запэўнівае **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Юрый КРУГЛІК.** — Мы сфарміравалі тэхнічныя патрабаванні да ўсіх тых матэрыялаў, якія распрацоўваюцца і размяшчаюцца на платформе. Зразумела, што рыхтуемся да вялікіх нагрузак — актыўнага наведвання платформы, прычым адначасовага. Плануецца адзіная сістэма аўтэнтыфікацыі карыстальнікаў, выкарыстанне вэб-інтэрфейсаў, якія будуць забяспечваць магчымасць аддаленай і размеркаванай працы карыстальнікаў усіх катэгорый.

Калі казаць пра наборы асноўных функцый, то, безумоўна, гэта лічбавы профіль для кожнай установы адукацыі, кожнага вучэбнага класа альбо вучэбнай групы. Таксама мы закладваем магчымасць аўтаматызаванай сістэмы кіравання ўстановай адукацыі. Гэта і пытанні раскладу заняткаў, уліку харчавання, нагрузкі на педагагічных работнікаў, аналізу паспяховасці навучэнцаў.

Юрый Круглік акцэнтаваў увагу на тым, што з улікам пэўных рызык у перыяд пандэміі альбо пры неабходнасці арганізоўваць надомнае навучанне прадугледжваецца магчымасць праводзіць заняткі дыстанцыйна. «Педагог выступіць у ролі мадэратара заняткаў. Таксама будуць выкарыстоўвацца магчымасці групавога альбо індывідуальнага чата, стасункі ў рэжыме відэаканферэнцыі», — патлумачыў ён.

У хуткім часе ў рэгіёнах пачнуцца семінары для педагогаў, што дазволіць пазнаёміць іх з новым рэсурсам і пачуць прапановы па яго далейшым удасканаленні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯКУЮ КНІГУ ПАКЛАСЦІ ДЗІЦЯЦІ ПАД ЁЛАЧКУ?

Топ-12 беларускіх дзіцячых выданняў — 2020

Які найлепшы падарунак для дзіцяці на Новы год і Каляды?
Кніга, вядома ж.
А якая?
Найперш беларуская!
Для мяне адказы на гэтыя пытанні, як для чалавека літаратурнага, відавочныя. Тым больш прапанаваць ёсць што! Нягледзячы на ўсе нялёгкасці года, які мы адпраўляем прэч, дзякуючы Богу, што перажылі яго, нашы кнігавыдаўцы падарылі дзеткам нямала цікавых навінак. А каб вы маглі сарыентавацца, што ж найлепей набываць, давайце напачатку паглядзім, што ж адбываецца сёння з беларускай дзіцячай кнігай.

Па-першае, з'явілася шмат кніжных серый. Вядома, гэта цікава і чытачам, і выдаўцам. Для хатняй бібліятэкі, у выпадку калі кніга спадабаецца, хочацца набыць усю серыю. Напрыклад, усе выпускі зборнікаў «Мастацкай літаратуры» пра поры года альбо ўсе кнігі пра старога Пэтсана і коціка Фіндуса выдавецтва KOSKA.

Яшчэ заўважна, што з'явілася шмат выданняў, якія распавядаюць зусім маленькім пра беларускую гісторыю і культуру. Даступна і займальна — пра Вітаўта і Міхала Клеафаса Агінскага, Францыска Скарыну і Максіма Багдановіча... Пра народныя музычныя інструменты, як у кнізе Аксаны Спрынчан і Яраша Малішэўскага; пра беларускую міфалогію, пра якую распавяла Ірына Клімковіч. А яшчэ сучасныя пісьменнікі ўсё часцей робяць героямі персанажаў тае беларускай міфалогіі. А што, свойскі Цмок не меней каларытны, чым які-небудь толкіенаўскі Смаўг!

Немагчыма не заўважыць і бум перакладной літаратуры! Калі ў вас дома падлеткі, неадкладна набывайце, каб пакласці пад ёлачку, кнігі на беларускай пра Гары Потэра і Ведзьмара, выпушчаныя выдавецтвам «Янушкевіч». Перакладныя кнігі для дзяцей звычайна добрай якасці, бо яны ж абраныя таму, што сталі бестселерамі ў іншых краінах, да таго звычайна друкуюцца з арыгінальным афармленнем, як «Чарнічны мішка. Каляндар для летуценнікаў» украінскай пісьменніцы Анастасіі Валхоўскай, што выдала «Мастацкая літаратура». А з'явіліся яшчэ і выданні для дзяцей, дзякуючы якім можна вучыць мовы, — кнігі-білінгвы. Напрыклад, «Бегла ліска з лесу блізка» выдавецтва «Беларуская навука».

Яшчэ адна тэндэнцыя — вялікі попыт на беларускую класіку! Гэта і народныя казкі, і напісанае Караткевічам, Барадуліным, Купалам, Коласам... Да каго ж яшчэ ісці па парады ў няпросты час, як не да іх?

Запаўняюцца незапоўненыя нішы, асвойваюцца новыя для беларускай літаратуры формы. Кніга-квэст? Калі ласка, Кацярына Хадасевіч-Лісавая напісала «Ключ ад вялікай каштоўнасці». Коміксы, анімэ? Вось вам кніга Евы Вайтоўскай «Гарэзлівы пацалунак». Наракалі, што мала дзіцячага фэнтэзі? Да вашых паслуг «Ключ дарог» Лілі Ілюшынай. Папракалі, што няма кніг на «складаныя» тэмы? Звярніце ўвагу на «Лета Гартмана», дзе для самых маленькіх распавядаецца пра... смерць. А калі маладым мамам здаецца, што ўсё яны робяць не так, звярніце ўвагу на кнігу Веранікі Ляўчук «Мама Зорачка і Маленькая Зай». Аўтарка, сама маладая мама, свой досвед пераўвасобіла ў чароўныя гісторыі з казачнай краіны. Здаецца, абвінавачванні ў прымітыве і аднастайнасці нашай дзіцячай літаратуры ўжо неактуальныя, прынамсі пасля «Фантазюрак» Веры Бурлак, «Нататак таткі» Андрэя Хадановіча, «Сумнага супу» Вольгі Гапеевай ну і чорнагумарных «Балтыйскіх шкарпэтак» Сяргея Календы.

І прыемна, што з'яўляюцца персанажы, якія не проста запамінаюцца, а выходзяць за межы кнігі, увасабляюцца мастакамі ў матэрыяле, робяцца героямі спектакляў і інтэрактыўных дзей, як незабыўныя паны Кубліцкі ды Заблоцкі Пятра Васючэнкі, Лахнэска Алены Масла, авечка Адэля Наталлі Бучынскай, Кот Шпрот Ганны Янкуты...

Карацей, выбіраць ёсць з чаго, а пакуль паглядзім, што набыць у кнігарні для маленькага чытача.

Серыя «12 месяцаў». «Мастацкая літаратура»

Не зробіце памылку, калі пакладзяце пад навагоднюю ёлачку ярка афармлены камплект з дванаццаці кніг «12 месяцаў». Гэта — чытанка на кожны дзень. Нават каляндар ёсць, дзе распісана, якую казачку калі чытаць. А казачкі адборныя! І народныя — не толькі беларускія, але і ўсіх народаў свету, і найлепшая сусветная класіка ў перакладзе на беларускую мову: Грым, Андэрсэн і нашы сучасныя аўтары... Рускія аўтары, дарэчы, даюцца на рускай мове. А кожны том яшчэ і мастацкі альбом, бо для афармлення выкарыстана класіка беларускай ілюстрацыі з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. Карацей, пастарайцеся сабраць усе кнігі, але нават адна, снежаньская, з зімовай тэматыкай, стане цудоўным падарункам!

Кацярына Хадасевіч-Лісавая. «Вухуцік. Васільвася». Выдавецтва «Звязда»

Добра, калі вам пашчасціла трапіць на прэзентацыі гэтай пісьменніцы — тэатралізаваныя, фантазійныя, на якіх аўтарка прысутнічае ў выглядзе Кніжнай феі. Але калі не ўжывую, дык з Кніжнай феяй можна камунікаваць анлайн. Новая кніга «Вухуцік. Васільвася» — дзве кнігі ў адной. Адзін варыянт напісаны для дзяўчынак, другі — для хлопчыкаў. Зразумела, цікаўны чытач прачытае абедзве, каб трапіць у «вандрульню». Самі даведайцеся, што такое. Гэтым разам антуражам абраная не беларуская міфалогія, як у кнізе-квэсце «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці», а фантастыка, бо Вухуцік і Васільвася прыляцелі, уявіце сабе, з космасу. Праўда, праз магічны партал. Ну а што ім, яны ж героі, яны могуць!

«Вядзьмар, які рабіўся ваўком». Беларускія чарадзейныя казкі. Укладальнік Антон Францішак Брыль. Выдавецтва «Янушкевіч»

Кніга, якая ўразіць на ўсё жыццё, праўда, можа і настрашыць. Чарадзейныя беларускія казкі ў добрай апрацоўцы плюс чарадзейнае афармленне славутага Валерыя Славука. Дзівосны і застрашлівы свет ваўкалакаў, цмокаў, ведзьмакоў, непралазных нетраў... Сярод трыццаці казак многія пададуцца вам незнаёмымі: яны ўзятыя з фальклорных збораў XIX — пачатку XX стагоддзя. Зрэшты, кожнае выданне, афармленае Валерыем Славуком, можна ставіць і на паліцу альбомаў па мастацтве.

Юя Вісландэр, Свэн Нурдквіст. «Мама Му, Крумкач і Каляды». Выдавецтва KOSKA

Вось ужо не першы год беларускія дзеткі ахвотна чытаюць казкі пра разумную і трохі дзіўную карову Маму Му і яе сябра Крумкача. Казкі прыдумала вядомая шведская пісьменніца Юя Вісландэр, а мастак Свэн Нурдквіст праілюстраваў. На беларускую іх пераклала Надзея Кандрусевіч, яна ж выступае і як выдавец. Калі вас не бянтэжыць, што карова, салідная такая істота, чытае, гайдаецца на арэлях, катаецца на санках і ўвогуле мае амбіцыі даследаваць свет, — далучайцеся разам са сваімі дзеткамі да прыхільнікаў гэтай серыі! Тым больш ёсць і размалёўка, і кніжка-кардонка для самых маленькіх.

Алег Грушэўскі. «Краіна Вымярэнія». Выдавецтва «Кнігазбор»

Для большай разнастайнасці — вось вам і адукацыйная казка! У гульнявой форме, з дапамогай ілюстрацый Віктара Козела дзеткі даведваюцца пра адзінкі вымярэння. Казачныя гісторыі адбываюцца ў краіне, дзе жывуць разумныя звяры, напрыклад, мама-рысь пасылае сына ў млячарню па малако. І маленькаму рысяняці разам з чытачом давядзецца здагадацца, колькі ж таго малака браць: кілаграм, метр альбо літр. А як пазнаваць час па гадзінніку са стрэлкамі, зайчаняткі вучацца, дзелячы спечаны маці-зайчыхай яблычны пірог. Хоць кніга не сёлетняя, ёй крыху больш часу, але падобнай не з'явілася, таму звярніце ўвагу.

Уладзімір Караткевіч. «Жабкі і чарапаха». Серыя «Жывая класіка дзецям». «Мастацкая літаратура».

Нават калі вы не разлічвалі на асаблівыя затраты, усё адно можаце набыць цудоўны падарунак, калі звернеце ўвагу на серыю выдавецтва «Мастацкая літаратура» «Жывая класіка дзецям». Невялікія, але якасна выдадзеныя і афармленыя кніжкі прадстаўляюць найлепшыя творы беларускіх класікаў. Акрамя цудоўнай і вельмі актуальнай казкі юбіляра гэтага года Уладзіміра Караткевіча «Жабкі і чарапаха» — «І нашто, калі ты зялёны і мяккі, лаяць таго, хто карычневы і цвёрды?», — у серыі пабачыла свет яго ж казка «Лебядзіны скіт», вершы Алеся Пісьмянкова «Бабчыны дранікі» і Рыгора Барадуліна «Сем янотаў», апавяданні Ядвігі Бяганскай «Дзе начавалі рукавічкі» і іншае. Можна таксама збіраць цэлую серыю!

Анатоль Клышка. «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга». Выдавецтва «Беларусь»

«У Італіі, у адным з найстарэйшых у свеце Падуанскім універсітэце, ёсць славутая «Зала сарака». На покуці стаіць зробленая з тоўстых дошак, сёння паточаная ўжо шашалем трыбунка-кафедра. Яна памятае, як некалі тут чытаў лекцыі Галілей». Так пачынаецца аповед пра Францыска Скарыну — згадзіцеся, адразу захоплівае. У гэтым годзе выдавецтва «Беларусь» перавыдала ў цвёрдай вокладцы гэты твор пра нашага першадрукара і гісторыю кнігавыдання. Аўтар — Анатоль Клышка, слынны пісьменнік і навуковец. Менавіта па яго «Букварах» вучыліся некалькі пакаленняў беларускіх школьнікаў.

Дзмітрый Пятровіч. «Дзіцячы атлас Беларусі. Легенды і паданні». «Мастацкая літаратура»

Вы яшчэ не купілі свайму дзіцяці ніводнага «Дзіцячага атласа Беларусі»? Неадкладна купляйце! Можаце пачаць вось з гэтага выпуска, аўтар якога — паэт Дзмітрый Пятровіч, які нядаўна пайшоў з жыцця. На кожным развароце — карта Беларусі, дзе пазначана, адкуль менавіта з'явіліся асілак Мененск, разбойнік Машэка, селянін Добруш, князь Альшан, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, княгіня Рагнеда. Пра кожнага персанажа — кароткі займальны аповед. У той жа серыі набудзьце атлас аўтарства Яраша Малішэўскага «Замкі, крэпасці, бажніцы», Наталлі Карліёнавай пра птушак Беларусі, Станіславы Умец пра славутых асоб краіны... Відовішчна і карысна!

Эрвін Мозэр. «Неверагодныя гісторыі на дабранач». Выдавецтва «Янушкевіч»

З усяго багацця перакладных дзіцячых кніг назаву, бадай, яшчэ і гэтую — сучаснага аўстрыйскага пісьменніка і ілюстратара Эрвіна Мозэра. Кніга сёння ў свеце лічыцца бестселерам. Кароценькія, на старонку-паўтары, забаўныя гісторыі з выдатнымі ілюстрацыямі — усяго іх восемдзесят восем. Мышка Ліманэла дрэсіруе леапарда, коцік чытае кнігі, кенгуру катаецца на лыжах, ёсць тут і Гранд-гатэль, і замак на востраве, і цырк... Дзецям падабаецца. У тым ліку за лаканічнасць твораў. Раз — і прачытаў!

Ягор Конеў. «Прыгоды дамавічкоў». Выдавецтва «Звязда»

Вось і прыклад, як сучасны аўтар выкарыстоўвае беларускую народную міфалогію. Ягор Конеў, аўтар гістарычных раманаў, любіць ствараць гісторыі пра дамавічкоў. Прынамсі, ёсць у яго п'еса менавіта пра дзіўную парачку — гаспадарлівага Шушыка і гарэзу Жулю. Дзейнічаюць яны і ў гэтай кнізе. Жывуць дамавічок і дамавушка ў вёсцы, у адной хаце на ўскраіне... Ясна, што даводзіцца альбо вечна сварыцца, альбо вучыцца прымаць адно аднаго ды разам змагацца за дабрабыт.

Ганна Янкута. «Марта і яе мара пра снег». Выдавецтва «Папуры»

А вось гэтая кніга зусім свежанькая! Аўтарка гісторый пра Ката Шпрота гэтым разам расказвае пра... снег. Марыць сабе дзяўчынка Марта, каб пачалася сапраўдная зіма, а тут грозюка ды грозюка. Але нездарма сказана: бойцеся сваіх жаданняў. Мара спраўджваецца, і на горад паваліў снег, чысценькі, пухнаценькі і шмат... Вельмі шмат... Ой, задужа шмат... Давядзецца не толькі марыць пра іншае, але і дзейнічаць.

Вольга Гапеева. «Адна шкарпэтка і іншыя гісторыі». Выдавецтва «Галіяфы»

Яшчэ адна дзіцячая кніга, выпушчаная проста да Каляд. Вольга Гапеева — вядомая паэтэса. І гісторыі яе для дзетак асабліва вобразныя. Усяго іх шэсць, у афармленні Насты Івановай, але якія! «Хамелеон Луіза і калготы»: і захочаш — не прадкажаш зместу. «Авакада і каноэ», «Слімак Раджэш і ёга»... Заінтрыгаваны? «У гэты дзень Авакада і Каноэ шмат смяяліся, плавалі і не расставаліся ні на хвіліну». Насмеяцеся таксама разам з дзеткамі.

А добрых беларускіх кніг для дзетак куды больш, чым можна назваць у адным артыкуле. Так што светлых вам свят, недарэмных спадзяванняў і добрага чытання!

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Уцяпліцца, каб не журыцца

НАВОШТА РАБІЦЬ ДОМ ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНЫМ

Калі трэба ўцяпляць дом і ці варта гэта рабіць увогуле? Як пераканаць уласнікаў, што ўдасканаленне стану будынка ў цэлым будзе выгадна для кожнай кватэры ў прыватнасці? Навошта ўкладваць грошы сёння, каб атрымаць выгаду ў будучыні? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні, звязаныя з прафесійным кіраваннем жыллём і ўзаемадзеяннем паміж жыхарамі і ўладамі, шукалі і абмяркоўвалі анлайн і афлайн спецыялісты з Беларусі, Германіі, Эстоніі, Латвіі, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана, Украіны, Расіі на семінары FpB-19018 «Узаемадзеянне паміж сектарамі ў энергетычнай мадэрнізацыі жылых дамоў», якую зладзіла Міжнародная асацыяцыя менеджменту нерухомасці (МАМН).

Праводзіць энергетычную санацыю жылля трэба правільна, з улікам індывідуальных асаблівасцяў будынкаў у кожнай краіне. У Савецкім Саюзе выкарыстоўваліся адны матэрыялы, а ў Германіі іншыя, так што проста інтэграваць вопыт санацыі адной краіны ў іншую немагчыма. Трэба адаптавацца пад мясцовыя ўмовы і разглядаць уцяпленне з эканамічнага боку, бо не ўсе дзеянні апраўданыя, а празмерная санацыя нясе непатрэбныя выдаткі, упэўнены **Вернэр МЕРКЕЛЬ, старшыня праўлення МАМН.**

— Часам, праводзячы санацыю дома, можна згубіць больш грошай, чым калі яе зусім не рабіць. Перш чым пачынаць цеплярэнавацыю будынка, трэба праводзіць папярэдні аналіз стану дома і аналізаваць эканамічную мэтазгоднасць усіх мер па санацыі, каб загадзя разумець, што трэба рабіць і якія сродкі можна сэканоміць за кошт уцяплення. Здараецца, што лепш нічога не рабіць з эканамічнага пункту гледжання, чым пачынаць работы, бо яны стануць дарэмнымі. І такім чынам атрымаецца сэканоміць больш грошай, калі нічога не рабіць і не ўкладваць ва ўцяпленне, бо прасцей будзе замяніць будынак іншым, чым ратаваць яго з дапамогай санацыі.

Нямецкі эксперт параіў не толькі праводзіць папярэдні аналіз стану будынка, але і паведамляць уласнікам пра магчымасці санацыі дома і даведвацца ў жыхароў, чаго яны хочуць. Часам уцяпленне патрабуе вялікіх сродкаў, якіх ва ўласнікаў проста няма, і дзяржава павінна дапамагчы людзям у гэтым, лічыць ён.

У Беларусі дапамога дзяржавы пры цеплавой мадэрнізацыі дамоў ужо аказваецца, запэўніў удзельнікаў канферэнцыі **Генадзь ТРУБІЛА, першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі,** які расказаў, што робіцца для гэтага:

— У ліпеньскай рэдакцыі закона «Аб абароне правоў спажыўцоў ЖКП» асноватворнай прызнана паслуга па кіраванні агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання, што мае на мэце арганізацыю аказання асноўных і дадатковых камунальных паслуг, у тым ліку энергаэфектыўных мерапрыемстваў, упаўнаважанай асобай на падставе дагавора. А Указ № 327 якраз і прадугледжвае стварэнне ўмоў для ўдзелу грамадзян у рэалізацыі мерапрыемстваў па цеплавой мадэрнізацыі будынкаў з дзяржпадтрымкай.

Умовы для энергаэфектыўных мерапрыемстваў у Беларусі досыць памяркоўныя. Фактычна усё, што цяпер патрабуецца ад уласнікаў жылля ў нашай краіне, — сабрацца на сход і прагаласаваць за прапанаванае рашэнне для энергетычнай санацыі падчас капрамонту, каб зменшыць расходы на агульныя работы, лічыць **Генадзь КАЛЁНАЎ, выканаўчы дырэктар МАМН:**

— Ужо прыкладна пралічана, што растэрмінаваныя на дзесяць гадоў выплаты за работы па ўцяпленні для трохпакаёвай кватэры складуць 30-40 рублёў у месяц. Каля 20 рублёў на працягу 15 гадоў будуць плаціць малазабяспечаныя сем'і. Аднак уласнікі ўсё роўна не хочуць у гэтым удзельнічаць, хоць у перспектыве сума камунальных плацяжоў будзе памяншацца за кошт праведзенай мадэрнізацыі і, адпаведна, памяншэння затрат на эксплуатацыю будынка.

ЧАМУ НЯМА ЗГОДЫ

У Беларусі існуюць планы капітальнага рамонту на пяцігодку. На кожны год даводзяцца дакладныя лічбы па правядзенні капітальнага рамонту. Па даручэнні ЖКГ абласнымі выканкамамі і Мінскім гарадскім выканкамам складзены пералікі дамоў, якія падлягаюць цеплавой мадэрнізацыі. Пры гэтым тэарытычна ў чаргу на капрамонт ставяцца дамы, якім споўнілася 30-35 гадоў, зыходзячы з іх тэхнічных характарыстык і фізічнага стану. Аднак ёсць выпадкі і «маладзейшыя», калі тэхнічнае і інжынернае начынне будынка «састарэла» раней.

Тым не менш за год дзеяння Указа № 327, які прапануе рабіць дом энергаэфектыўным падчас капрамонту па прынцыпе 50 % укладанняў з боку дзяржавы, 50 % — ад уласнікаў жылля, на такія ўмовы пагадзіліся жыхары 24 дамоў у краіне. І толькі адзін будынак у Дрыбіне Магілёўскай вобласці зроблены.

Генадзь Трубіла лічыць, што гэта не той паказчык, якім трэба хваліцца, але гэта ўжо лепш, чым на пачатку дзеяння Указа № 327, калі ўласнікі проста рэагавалі на прапановы з пазіцыі «дзяржава ўсё павінна», бо ўсе так прывыклі.

— Цяпер мы бачым ужо дакладныя моманты, як працаваць з людзьмі. У прыватнасці, Мінжылкамгас зацікаўлены ў дапамозе міжнародных экспертаў пры распрацоўцы тэхніка-эканамічнага абгрунтавання эфектыўнасці мерапрыемстваў, якія прапаноўваюцца да рэалізацыі, — заўважыў Генадзь Трубіла. — Неабходна таксама распрацоўка методыкі папярэдняй ацэнкі кошту работ па кожным відзе энергаэфектыўных мерапрыемстваў.

Меркаваннямі, чаму ўласнікі жылля не пагаджаюцца на энергаэфектыўныя мерапрыемствы, падзяліліся спецыялісты, якія непасрэдна ведаюць, як праводзяцца сходы з уласнікамі жылля перад пачаткам капрамонту.

— Сходы праводзіць складана, бо, па-першае, на іх прыходзяць звычайна толькі 30—40 % жыхароў. Па-другое, згодна з пастановай Саўміна № 324, не ўсе работы па капрамонце цяпер праводзяцца за кошт адлічэнняў на капрамонт. Работы падраздзяляюцца, і далёка не ўсе грамадзяне хочуць удзельнічаць у гэтым. Тым больш што чаканні ад капрамонту ва ўсіх розныя, і многія памятаюць часы, калі падчас капрамонту выконваліся ўсе работы і па доме, і па інжынерных сетках, і будынак выходзіў як з карцінкі. Цяпер гэтыя работы абмежаваныя нарматыўнымі дакументамі, — выказаўся **Вячаслаў БАТУРА, намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду і вытворчых пытаннях Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

Уцяпленне дома цяпер праводзіцца за бюджэтны кошт, калі ёсць заключэнне праектнай арганізацыі, што вонкавыя канструкцыі маюць патрэбу ва ўцяпленні. Калі такога дакумента няма, уцяпліцца ўласнікам прапануюць за ўласны кошт, падкрэсліў ён.

Галоўная задача работнікаў ЖКГ — давесці да ўласнікаў, што іх фінансавы ўдзел у энергазберагальных мерапрыемствах на іх доме патрэбен найперш ім самім, бо гэта і камфорт павысіць, і выдаткі на камунальныя плацяжы ў далейшым паменшыць, упэўнены **Павел ВЯСЁЛКА, намеснік начальніка абаненцкага аддзела Жыллёва-камунальнай гаспадаркі № 1 Маскоўскага раёна Мінска:**

— Трэба дакладна расказваць людзям пра мерапрыемствы, пра тэрмін акупнасці і іншае, і зрабіць гэта проста каля пад'езда цяжка, тым больш у час пандэміі і ўзімку. З 24 сходаў запланаваных удалося правесці 18 па тых дамах, якія налета мяркуецца капітальна рамантаваць. Ніводнага станоўчага рашэння з жыхарамі прынята не было. Хоць з'яўляюцца свядомыя жыхары і мы стараемся схіліць іх да супрацоўніцтва, каб ужо яны расказвалі іншым уласнікам пра карысць мерапрыемстваў.

ЧЫМ КАРЫСНЫ ЭНЕРГААЎДЫТ

Уласнікі жылля ва Украіне пагаджаюцца на энергаэфектыўныя работы ў доме значна часцей, чым беларусы. Магчыма, таму, што і кошт за ацяпленне тут вышэйшы, чым у Беларусі, і праграмы распрацаваны на розных узроўнях. Аднак тамтэйшыя эксперты маюць і ўласную практыку работы з жыхарамі.

Перш чым праводзіць капрамонт, на сходзе членаў праўлення АСШД (аб'яднання саўладальнікаў шматкватэрнага дома — так ва Украіне называюцца таварыствы ўласнікаў) прымаецца рашэнне аб правядзенні энергааўдыту дома за ўласныя сродкі, расказала пра ўкраінскі вопыт **Любоў КАРПЕНКА, старшыня праўлення Запарожскага рэгіянальнага цэнтра асветы і тэрмамадэрнізацыі і стварэння АСШД «КРУГ»:**

— Гэта не надта вялікія грошы. Аднак на рукі вы атрымліваеце дакументы, дзе паказаны стан дома, рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі. Таксама мы ствараем рабочую групу, куды ўваходзяць таксама актыўныя саўладальнікі жылля, якія хочуць, каб дом стаў больш камфортным і жыццяздольным. Толькі пасля гэтага мы разам з кансультантам рыхтуем прэзентацыю, дзе робім дакладны разлік для кожнага віду кватэр і па грашовых укладаннях, і па рэальных выніковых лічбах эканоміі. І толькі пасля гэтага ідзём на агульны сход да ўсіх уласнікаў, кожны з якіх на прыкладзе ўбачыць магчымасць эканоміі.

Магчыма, менавіта такі падыход трэба рабіць і ў Беларусі, каб уласнікі бачылі разлікі па сваім доме і кватэры, а не прыблізныя ўсярэдненыя лічбы па абстрактным будынку, мяркуе Генадзь Калёнаў.

— У Беларусі шмат дамоў аднолькавых серый. Магчыма, мае сэнс браць інфармацыю па зробленым пілотным будынку і, разумеючы, што разлікі, пэўна, будуць не вельмі адрознівацца ў падобным жыллі, паказваць уласнікам больш дакладныя лічбы, якія яны могуць атрымаць. Тады і пагаджацца псіхалагічна жыхарам будзе лягчэй.

Вопыт энергазберагальнай санацыі ў Берліне ў раёне Марцан-Хелерсдорф (гэта панэльная забудоўля са 100 тысяч кватэр, 90 % з якіх саніраваны) сведчыць, што мае сэнс ствараць тыпавыя рашэнні для санацыі дамоў серыйнай забудоўлі, пагадзіўся **Бернхард ШВАРЦ, дырэктар праектаў Ініцыятывы «Жыллёвая гаспадарка ва Усходняй Еўропе» (Берлін, Германія):**

— Хоць, вядома, кожны будынак усё роўна мае свае асаблівасці, аднак перавага такога падыходу ў тым, што мы атрымліваем сумы, неабходныя для санацыі дома ў адным раёне.

Яшчэ адна праблема стасункаў з жыхарамі ў Беларусі ў тым, што ў старых будынках пераважна жывуць пенсіянеры, якія маюць невялікую пенсію і адразу апелююць супраць укладанняў: «А колькі мне жыць засталося?» Тым больш што на сходах каля пад'езда адзінае, што чуюць людзі, — трэба плаціць, і далей ужо не ўнікаюць у сутнасць, кажуць старшыні айчынных таварыстваў уласнікаў. Пэўна, схіліць іх да ўцяплення можа толькі адчувальнае павелічэнне тарыфаў на энерганосьбіты або, магчыма, разуменне, што ў будучыні мадэрнізаванае цяпер жыллё, якое застанецца ў спадчыну дзецям-унукам, будзе больш прывабным па кошце.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Анколаг Сяргей КРАСНЫ:

«ПРЫ НЕКАТОРЫХ ЗЛАЯКАСНЫХ ПУХЛІНАХ ПАЦЫЕНТ НЕ ЗАРАЖАЕЦЦА COVID-19»

Нягледзячы на распаўсюджанне каранавіруснай інфекцыі, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава працягвае лячэнне пацыентаў з ракавымі пухлінамі. Цяпер тут прымаюць хворых ледзь не з усёй краіны. Як каранавірус паўплываў на работу анкалагічнай службы і ці варта чакаць усплёску новых выпадкаў раку, калі пандэмія завершыцца? Як анкалагічныя пацыенты пераносяць COVID-19? Калі адновяцца праграмы ранняга выяўлення пухлін і каго найперш будуць правяраць на рак страўніка і рак лёгкіх? Пра гэта і іншае расказаў намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей КРАСНЫ.

— Сяргей Анатолевіч, як распаўсюджанне COVID-19 адбілася на дыягностыцы анказахворванняў, рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі і на паводзінах саміх пацыентаў?

— Гэта, безумоўна, вялікая праблема. Распаўсюджанне каранавіруснай інфекцыі паўплывала на работу ўсёй анкалагічнай службы. Найперш, многія анкалагічныя дыспансеры ў краіне пераарыентаваны — часткова ці цалкам — на аказанне дапамогі пацыентам з ковіднай інфекцыяй. Адпаведна, анкалагічныя хворыя, якія мусілі лячыцца там, перанакіраваны да нас. Але гэта не стала прычынай перагрузкі нашага цэнтра. Цяпер у нас заўсёды ёсць свабодныя месцы, бо колькасць анкалагічных пацыентаў, якія прыязджаюць на лячэнне, значна зменшылася.

Звязана гэта з двума фактарамі. Па-першае, на першапачатковых стадыях злаякасных пухлін часцей за ўсё не трэба аказваць тэрміновую дапамогу. Гэтыя пухліны, як правіла, марудна прагрэсіруюць, і за 1—3 месяцы стан здароўя гэтых пацыентаў істотна не зменіцца, таму можна дачакацца зніжэння захваральнасці на каранавірусную інфекцыю і пралячыць іх вясной ці летам. Па-другое, паліклінікі і раённыя бальніцы цяпер працуюць з вялікай перагрузкай і аказваюць дапамогу пераважна пацыентам з інфекцыяй COVID-19. Натуральна, займацца планавай дапамогай, у тым ліку дыягностыкай злаякасных пухлін, яны не могуць, цалкам спынены скрынінг. Адпаведна, колькасць анкалагічных пацыентаў, якія выяўляюцца, зменшылася. Таму вялікага наплыву ў наш цэнтр няма.

Мы цалкам спраўляемся з тымі пацыентамі, якія да нас паступаюць. Шпіталізацыя ў нас арганізавана вельмі строга: усе павінны мець адмоўны тэст на каранавірусную інфекцыю. Акрамя таго, перад шпіталізацыяй мы робім усім нашым пацыентам камп'ютарную тамаграфію лёгкіх, таму што нават пры адмоўным аналізе на COVID-19 праскоквaюць выпадкі з бессімптомнай пнеўманіяй. Бо ПЦР-аналіз, на жаль, не валодае 100-працэнтнай дакладнасцю. Акрамя таго, ён сапраўдны на працягу некалькіх дзён, і за гэты час чалавек можа падхапіць інфекцыю. Яму паспяваюць зрабіць аперацыю, і пасля праяўляюцца сімптомы хваробы — такія выпадкі, на жаль, таксама бываюць. Такі пацыент можа заразіць суседа па палаце ці медыцынскі персанал.

Некаторыя супрацоўнікі нашага цэнтра або перахварэлі, або хварэюць у цяперашні час. Гэта таксама выклікае пэўныя цяжкасці, але мы да іх прызвычаіліся. У цэнтры распрацавана сістэма барацьбы з COVID-19. Пацыентаў, у якіх выяўляецца інфекцыя, мы адразу пераводзім у адпаведныя спецыялізаваныя ўстановы, за выключэннем тых выпадкаў, калі ім патрабуецца тэрміновая анкалагічная дапамога. Для гэтага ў нас ёсць спецыялізаванае аддзяленне — ізаляванае, з чырвонай зонай. І там аказваецца дапамога пацыентам са спалучэннем анкалагічнага захворвання і каранавіруснай інфекцыі.

Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы сказаць словы падзякі і захаплення ўсім медыцынскім работнікам, якія ў гэтыя складаныя часы, не шкадуючы сябе, працуюць з вялікім напружаннем, выратоўваючы нашых пацыентаў. Паверце, што мужнасць і гераізм у дачыненні да іх — не пафасныя словы, а штодзённая рэчаіснасць.

— Як пацыенты з анкалогіяй пераносяць COVID-19?

— Па меры назапашвання ведаў па спалучэнні каранавіруснай інфекцыі і анкалагічнай паталогіі высвятляюцца даволі цікавыя рэчы. Лагічна было б меркаваць, што анкалагічныя пацыенты часцей будуць хварэць і складаней пераносіць гэту інфекцыю, бо прынята лічыць, што іх імунная ахова зніжана. Але аказалася, што пры некаторых злаякасных пухлінах COVID-19 або ўвогуле не паражае такіх пацыентаў, або, калі яны і заражаюцца, захворванне працякае ў лёгкай форме. Прыкладам з'яўляецца Б-клетачная лімфома, калі функцыя Б-лімфацытаў рэзка парушана. Яны не выконваюць сваёй ахоўнай функцыі па выпрацоўцы антыцел. А пры каранавіруснай інфекцыі гэта надзвычай важна ў плане развіцця гіперімуннай рэакцыі або цытакінавага шторму. Такім чынам, у пацыентаў з лімфомай ён у прынцыпе не можа развіцца з-за недастатковых функцыянальных магчымасцяў Б-лімфацытаў.

Нядаўна высветлілася, што пацыенты з распаўсюджаным ракам прастаты, якія атрымліваюць гармонатэрапію, таксама або не заражаюцца, або хварэюць у лёгкай форме. Мабыць, блакада гарманальных рэцэптараў перакрыжоўваецца з тымі рэцэптарамі, праз якія дзейнічае вірус COVID-19. У іх таксама захворванне працякае ў лёгкай форме.

Але ў большасці выпадкаў анкалагічныя пацыенты хварэюць дастаткова цяжка. Бо гэта, як правіла, людзі пажылыя, у іх аслаблены арганізм. Таму мы ставім усе загараджальныя бар'еры, якія толькі магчыма, каб інфекцыя не распаўсюджвалася ўнутры цэнтра.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Вы сказалі, што скрынінгавыя мерапрыемствы цяпер спынены. Можна меркаваць, што, калі распаўсюджанне каранавіруснай інфекцыі пойдзе на спад, мы атрымаем усплёск анкалагічных хвароб?

— Па прычыне спынення скрынінгу гэтага не будзе. Бо скрынінгавыя праграмы разлічаны на здаровых людзей ці тых, хто сябе такімі лічыць. У іх, як правіла, выяўляецца нулявая ці першая стадыя захворвання падчас скрынінгу. Да развіцця другой стадыі праходзіць не адзін месяц, а часам і гады. У нулявой стадыі (так званага прадраку) захворванне развіваецца вельмі марудна. Таму з-за таго, што мы спынілі скрынінгавыя праграмы на некалькі месяцаў, нічога страшнага не адбудзецца.

А вось што датычыцца звычайнай дыягностыкі злаякасных пухлін, калі людзі звяртаюцца да ўрача са скаргамі, то тут сапраўды можа быць праблема, бо цяпер аказанне планавай дапамогі, на жаль, часова спынена. І гэтыя пацыенты церпяць, нягледзячы на тое што маюцца сімптомы, і не абследуюцца. І гэта можа мець сур'ёзныя наступствы: калі яны праз паўгода прыйдуць да анколага, у іх можа быць запушчаная стадыя злаякаснай пухліны. Гэта сур'ёзнае наступства пандэміі COVID-19, прычым, мяркую, такая праблема характэрна для ўсяго свету. І праз год-два гэта можа прывесці да павелічэння смяротнасці ад злаякасных пухлін.

— Акрамя чатырох вядомых скрынінгавых праграм па выяўленні раку шыйкі маткі, прастаты, грудзей і коларэктальнага раку, магчыма, у нас з'явяцца і іншыя?

— Калі захваральнасць на каранавірусную інфекцыю знізіцца, праекты па скрынінгу будуць працягвацца па ўсіх чатырох лакалізацыях. Акрамя гэтага, мяркую, што да таго часу ўжо скончыцца пілотны праект па скрынінгу раку страўніка.

На першым этапе пацыентам выконваюцца сералагічныя даследаванні: па аналізах крыві вывучаюцца аб'ёмы і суадносіны пепсінагенаў, наяўнасць хелікабактару. Калі маюцца гэтыя фактары і мы бачым, што рызыка злаякаснай пухліны ці атрафічных працэсаў у страўніку дастаткова высокая, робіцца гастраскапія. Прычым сярод гэтых пацыентаў, якім выконваецца гастраскапія, альбо пухліны, альбо перадпухлінныя працэсы выяўляюцца дастаткова часта. Ім праводзіцца мэтанакіраванае лячэнне. Дык вось пілотны праект паказаў дастаткова высокую эфектыўнасць, і мы спадзяёмся, што, калі стабілізуецца сітуацыя, будзем пашыраць скрынінгавую праграму на гэту лакалізацыю.

Ужо год ідзе праект па раку лёгкага, ён разлічаны на пяць гадоў. Пацыентам выконваецца нізкадозная камп'ютарная тамаграфія, і даволі часта выяўляюцца ўтварэнні ў лёгкіх на ранняй стадыі. Яны выдаляюцца, і гэта дазваляе знізіць смяротнасць ад раку лёгкага.

— Хто трапіць у праграмы скрынінгу раку страўніка і раку лёгкага?

— Па раку страўніка мэтавая аўдыторыя вылучаецца сярод тых, хто мае сімптомы захворвання. Але па вялікім рахунку яго трэба праводзіць і сярод тых, у каго найчасцей гэтыя пухліны сустракаюцца. Як правіла, гэта людзі пасля 40 гадоў, таксама сюды трапляюць курыльшчыкі. Пасля ўзроставыя рамкі будуць пашырацца. І дадаюцца людзі, у якіх ёсць спадчынная схільнасць: калі сваякі хварэлі на такія ж захворванні.

Што датычыцца раку лёгкага, то тут у групу рызыкі трапляюць выключна курыльшчыкі, прычым з вялікім стажам — не менш за 15 гадоў. Тут існуе спецыяльная формула разліку: 15 гадоў курэння на пачку цыгарэт у дзень. Калі па два пачкі ў дзень, чакаць 15 гадоў не трэба — захворванне развіваецца хутчэй. Па заканчэнні пілотнага праекта будуць зроблены высновы, наколькі ён эфектыўны для нашай краіны і ці можна яго выкарыстоўваць. Гэта нятаннае задавальненне, бо патрабуе дарагога абсталявання. Але не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. З прычыны распаўсюджання каранавіруса былі закуплены адпаведныя камп'ютарныя тамографы, якія ў спакойны перыяд будуць больш свабоднымі і іх можна будзе выкарыстоўваць для камп'ютарнай тамаграфіі лёгкіх у курцоў. Спадзяюся, што да завяршэння праекта пандэмія скончыцца, і будзем укараняць скрынінг раку лёгкага.

— Ці працуе метад вадкаснай цыталогіі, які мусіў замяніць ранейшы мазок на вызначэнне раку шыйкі маткі?

— Пакуль не праводзяцца скрынінгавыя праграмы, ён выкарыстоўваецца для звычайнай дыягностыкі. У пераходны перыяд усе жанчыны абследаваліся двума метадамі, каб навучыць і цытолагаў, і гінеколагаў, бо і сістэма забору матэрыялу, і падрыхтоўкі мазкоў зусім іншая. Цяпер навучанне скончылася, і калі COVID-19 пойдзе на спад, можна будзе больш шырока выкарыстоўваць вадкасную цыталогію.

— Што чалавек павінен правяраць у 30—40 гадоў?

— У дачыненні да злаякасных пухлін у 30 гадоў — нічога, за выключэннем раку шыйкі маткі, бо ён рэзка памаладзеў. Ён звязаны з распаўсюджаннем папіломавіруснай інфекцыі. І па прычыне больш ранняга пачатку палавога жыцця (ужо не рэдкасць, калі яго пачынаюць у 12—15 гадоў) у нас цяпер з'явіліся 25-гадовыя і нават 20-гадовыя пацыенткі з пухлінамі шыйкі маткі. Бо калі аслаблены ахоўныя сілы арганізма, пухліна можа развіцца не за 10 гадоў, а нават хутчэй. Таму з прычыны раку шыйкі маткі шырокамаштабны скрынінг праводзіцца з 30 гадоў. Увогуле ж, жанчына з пачатку палавога жыцця мусіць перыядычна наведваць гінеколага, і ён вырашае, калі выконваць цыталагічныя даследаванні.

Што датычыцца ўсіх астатніх злаякасных пухлін, то яны дастаткова рэдка сустракаюцца ў маладым узросце, таму мэтанакіравана абследавацца ў гэтым выпадку не трэба.

А вось пачынаючы з 40 гадоў з'яўляюцца больш сур'ёзныя праблемы са здароўем, таму трэба падключацца да розных скрынінгавых праграм. У залежнасці ад узросту мы ўключаем такіх пацыентаў у скрынінг раку малочнай залозы, прастаты і іншыя.

— А можа так здарыцца, што чалавек нармальна сябе адчувае, робіць час ас часу даследаванні, скажам, УГД грудзей, наведвае гінеколага, а потым у яго знаходзяць рак у трэцяй стадыі?

— Можа здарыцца і такое, але верагоднасць меншая, чым у тых, хто не ходзіць да доктара і не абследуецца, а чакае, пакуль яму стане дрэнна. Натуральна, колькі б мы ні мелі метадаў дыягностыкі, ні адзін з іх не валодае 100-працэнтнай эфектыўнасцю і магчымы як ілжыва-станоўчыя, так і ілжыва-адмоўныя вынікі. І адно і другое не надта добра. Пацыенту ставяць пры дапамозе таго ці іншага метаду падазрэнне на злаякасную пухліну, а падчас удакладняльнай дыягностыкі дыягназ здымаецца. Але псіхалагічную траўму пацыент атрымаў, у яго застаецца пэўны страх на ўсё жыццё. У гэтым недахоп скрынінгаў. Такія выпадкі даволі часта здараюцца, але да гэтага трэба быць гатовым, калі ідзеш на скрынінг, і не ўпадаць у паніку.

Ілжыва-адмоўныя вынікі таксама могуць быць, калі пухліна маленькая, і раздзяляльная здольнасць метаду не дазваляе яе выявіць. А потым пацыент з'яўляецца праз два гады на наступны этап скрынінгу, і пухліну знаходзяць, або на працягу двух гадоў праяўляюцца сімптомы — гэта так званы міжскрынінгавы рак. На жаль, такія сітуацыі бываюць, але нашмат радзей, чым сярод людзей, якія ўвогуле не абследуюцца.

Працяг размовы чытайце ў адным з наступных нумароў «Звязды».

СУСТРАКАЕМ НОВЫ ГОД ЭКАЛАГІЧНА

ЁЛКА: НАТУРАЛЬНАЯ ЦІ ШТУЧНАЯ?

Спрэчка на гэту тэму сярод эколагаў цягнецца даўно. І да сённяшняга дня яны не могуць даць адназначнага адказу, якую елку лепш выбіраць — у кожным варыянце ёсць свае плюсы і мінусы.

Так, натуральная ёлка — гэта жывая прырода. Сёння зялёную прыгажуню можна купіць на ёлачных базарах ці непасрэдна ў лясніцтвах. Туды навагоднія дрэвы трапляюць з плантацый, дзе іх вырошчваюць з гэтай мэтай каля дзесяці гадоў. Каб дрэва і пасля свят паслужыла дабру, а не трапіла на палігон, можна перадаць яго камунальнікам — так ёлкі выкарыстаюць для ацяплення будынкаў ці ў якасці кампосту. Некаторыя заапаркі таксама прымаюць дрэўцы ў якасці корму для жывёл.

Калі вам не даспадобы ссечанае дрэва, можна купіць ці нават узяць у арэнду елку ў кадцы. Вясной (пры ўмовах правільнага захоўвання) елачку можна пасадзіць на сваім зямельным участку ці ў найбліжэйшым лясніцтве падчас традыцыйнай акцыі «Тыдзень лесу».

Што ж датычыцца штучнай ёлкі, то яна можа дапамагчы прыродзе, калі яе выкарыстоўваць доўгі час, некалькі дзясяткаў гадоў. Мінус у тым, што такія дрэвы вырабляюць з нафтапрадуктаў, часта з кампазітных відаў пластыку, і іх нельга здаць на перапрацоўку. А полівінілхларыд, свінец, ртуць, фталаты ў складзе штучных ёлак могуць забрудзіць прыроду і негатыўна паўплываць на здароўе чалавека.

Вытворцы таксама шукаюць спосаб павысіць экалагічнасць штучных ёлак — напрыклад, вырабляюць іх з перапрацаванага і менш шкоднага пластыку ПЭТ. Але пакуль яны сустракаюцца радзей, чым ПВХ, і маюць вышэйшы кошт.

У якасці альтэрнатывы можна:

— выкарыстоўваць галінкі елкі замест цэлага дрэва;

— упрыгожыць жывую елку за горадам ці дамашнія дэкаратыўныя расліны, напрыклад пальмы;

— зрабіць ёлку з падручных матэрыялаў: гірлянды, старой газеты, кніг, сушаных ягад і долек цытрусавых — варта толькі падключыць фантазію, і ідэальны для вас варыянт хутка знойдзецца.

НАВАГОДНІЯ АЗДАБЛЕННІ

Чым бліжэй да Новага года, тым больш яркімі становяцца прылаўкі магазінаў ад безлічы цацак і гірляндаў. Таму бывае цяжка выбраць сапраўды вартыя і экалагічныя тавары. Што ж рабіць?

Самае лепшае — купляць як мага менш цацак, мішуры і гірляндаў. Можна перагледзець свае запасы — старыя ёлачныя цацкі таксама могуць стаць выдатным элементам святочнага дэкору.

Калі ж вы вырашылі абнавіць навагоднія аздабленні, выбірайце тавары з улікам іх доўгага выкарыстання і толькі ў спецыялізаваных месцах. Так можна быць больш упэўненымі, што цацкі адпавядаюць усім неабходным патрабаванням бяспекі і якасці. Купленыя з рук могуць утрымліваць свінец, фармальдэгіды і іншыя шкодныя рэчывы.

Лепш не выкарыстоўваць разнастайныя танныя ўпрыгажэнні з пластыку. Самымі ж экалагічнымі лічацца аздабленні з дрэва, шкла ці паперы — яны могуць жыць доўга, а потым трапіць на перапрацоўку.

Цацкі на ёлку таксама можна зрабіць сваімі рукамі. Напрыклад з перагарэлай звычайнай ці святлодыёднай лямпачкі (люмінесцэнтныя ўтрымліваюць ртуць, таму іх выкарыстоўваць нельга) ці прыродных матэрыялаў. На ёлцы або на вокнах таксама будуць выдатна глядзецца сняжынкі з паперы, нітак ці драўніны.

Калі выбіраеце агеньчыкі на ёлку, аддавайце перавагу святлодыёдным — яны не награваюцца, у адрозненне ад іншых відаў, а таксама значна эканомяць электраэнергію і пры беражлівых адносінах могуць праслужыць вельмі доўга.

ВЫБІРАЕМ ПАДАРУНКІ

Галоўныя атрыбуты свята — падарункі — таксама можна зрабіць больш экалагічнымі. Па-першае, не набывайце тавары толькі для таго, каб «нешта падарыць». Заўсёды рыхтуйцеся да свят загадзя, даведайцеся, што вашы родныя і сябры хочуць атрымаць у падарунак. Для гэтага проста ўважліва слухайце сваіх блізкіх падчас штодзённых размоў.

Выбірайце якасныя і даўгавечныя тавары. Сучасная тэхніка сёння ў асноўным «запраграмавана» на хуткае старэнне, каб людзі часцей куплялі новыя тавары, а не карысталіся наяўнымі. Таму пры выбары новых гаджэтаў уважліва вывучайце іх характарыстыкі і аддавайце перавагу найбольш трывалым.

Калі ёсць магчымасць, выбірайце «зялёныя» эквіваленты, напрыклад экакасметыку або экалагічныя гаджэты (энергазберагальныя падзарадкі).

Памятайце, што найлепшы падарунак — не рэч, а прыемныя эмоцыі і ўражанні. Калі ў тэатр ці кіно трапіць цяпер больш складана, можна падарыць падпіску на анлайн-кінатэатр або цікавую камп'ютарную гульню на экатэматыку.

Рабіце падарункі сваімі рукамі — прыгатуйце любімую страву для сябра, звяжыце цёплыя шкарпэткі, намалюйце партрэт любімага чалавека. Вашы таленты і фантазія дапамогуць стварыць найлепшы падарунак!

Ці патрэбна для падарункаў дадатковая ўпакоўка? Часам яна бывае залішняй. Калі ж без упакоўкі ніяк, зрабіце яе, напрыклад, са старых часопісаў і газет, карт, кавалачкаў тканіны, натуральных ці перапрацаваных матэрыялаў, альбо выкарыстоўвайце экаторбачкі і палатняныя мяшочкі.

НЕБЯСПЕЧНЫЯ АГНІ

Не можаце ўявіць святкаванне Новага года без залпаў салюту і ззяння бенгальскіх агнёў? Ведайце, што ўсе гэтыя забавы небяспечныя як для чалавека, так і для прыроды.

Феерверкі пужаюць птушак, траўміруюць іх. Не даспадобы такія выбухі і дамашнім гадаванцам, а таксама іх бяздомным сабратам.

Разам з прыгожымі агнямі ў святы гэта піратэхніка вылучае ў атмасферу вялікую колькасць таксічных рэчываў, якія могуць выклікаць дэрматыты, парушаць работу нервовай сістэмы, раздражняць дыхальныя шляхі. Пасля салютаў у паветры павышаецца канцэнтрацыя вуглякіслага газу, пылу і акісляльнікаў.

Нашкодзіць здароўю могуць і бенгальскія агні. Акрамя таго, металічны каркас, які застаецца пасля згарання хімічных рэчываў, не прымаецца на перапрацоўку.

Не меншую пагрозу нясуць і кітайскія ліхтарыкі — часам яны прыводзяць да пажараў. У некаторых краінах нават забаронена іх выкарыстанне.

ЭКАСМАЧНЫ СТОЛ

Каб наступны год быў багаты, многія з нас рыхтуюць на святочны стол шмат самых разнастайных страў. Але непазбежна частка з іх аказваецца ў сметніцы. Трапляючы на палігон, арганіка дрэнна раскладаецца і ўдзельнічае ва ўтварэнні парніковых газаў.

Таму калі вы не трымаеце гаспадарку і не можаце парадаваць навагоднімі стравамі сваіх гадаванцаў, у тым ліку каліфарнійскіх чарвякоў, якія з прадуктаў робяць карысны кампост, лепш скараціць колькасць навагодніх страў.

Спецыялісты таксама раяць купляць мясцовыя прадукты, каб зменшыць іх экалагічны след. Зразумела, ад мандарынаў і іншых экзатычных фруктаў адмаўляцца не варта. Але гародніну, мяса, малако, цукеркі выбірайце беларускай вытворчасці.

Дарэчы, з мандарынавых лупін, кававай гушчы і іншых ачысткаў можна зрабіць шмат карысных рэчаў, напрыклад цукаты ці розныя касметычныя сродкі. Пашукайце такія рэцэпты ў інтэрнэце — знойдзеце шмат цікавага.

СВЯТОЧНАЕ АДЗЕННЕ

На Новы год усе мы хочам выглядаць прыгожа. Як жа зрабіць гэта з карысцю для прыроды?

Лепш за ўсё не купляць новае адзенне, можна адрамантаваць ці перашыць старыя сукенкі і касцюмы. Калі ж без новых пакупак ніяк, перш за ўсё зазірніце ў дабрачынныя магазіны ці сэканд-хэнды. У звычайных крамах перад пакупкай звяртайце ўвагу на склад тканіны, краіну вырабу і сертыфікаты. Увогуле ж купляйце толькі тое, што сапраўды патрэбна і можна выкарыстоўваць не толькі ў навагоднюю ноч.

Многія перад Новым годам ачышчаюць шафы, пераглядаюць свой гардэроб. Непатрэбныя рэчы можна перадаць у вышэй названыя крамы, дабрачынныя праекты ці падарыць сябрам. Так мы зберажом рэсурсы і парадуем іншых людзей.

Калі хочаце ўпрыгожыць свой убор стразамі і паеткамі ці зрабіць бліскучы макіяж, памятайце, што не дапамагаеце гэтым прыродзе. Гэтыя бліскаўкі, ці глітэры, вырабляюцца з пластыку. Дробныя часцінкі палімераў (мікрапластык) не могуць трапіць на перапрацоўку, таму пасля выкарыстання акажуцца ў сметніцы ці ў водаправодзе, а пазней — у навакольным асяроддзі. Паводле даных вучоных, ужо сёння мікрапластык знаходзіцца ўнутры кожнай трэцяй рыбіны. Знаходзілі яго і ў страваваль най сістэме чалавека, а нядаўна часцінкі мікрапластыку ўпершыню ўбачылі ў плацэнце.

Некаторыя вытворцы ўжо пачалі ствараць экалагічныя глітэры, таму падчас выбару бліскучага тавару ўважліва вывучыце яго склад. А найбольш удалым варыянтам будзе ўвогуле адмовіцца ад бліскавак — найлепшым упрыгажэннем на Новы год будзе ваша ўсмешка і шчаслівы бляск у вачах!

Вераніка КОЛАСАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НОВЫ ГОД БЕЗ ЛІШНІХ КІЛАГРАМАЎ

Накрываем стол з аглядкай на талію

Новы год і Каляды ў нашай культурнай традыцыі — гэта шматгадзінныя застоллі з тлустым мясам і алкаголем, каларыйнымі салатамі, запраўленымі маянэзам. Гаспадыні выстаўляюць на стол усё найлепшае адразу — каўбасы, закаткі, марынады... Садавіну і «салодкі стол» таксама ніхто не адмяняў. У выніку наступнай раніцай мы звыкла мучымся ад галаўнога болю і цяжару ў страўніку, а праз месяц не можам улезці ў любімыя джынсы.

А ці магчымы Новы год без лішніх кілаграмаў? Аказваецца, так.

— Правільнае харчаванне за навагоднім сталом — не настолькі нерэальная задача, як гэта падаецца на першы погляд, — адзначае **старшы навуковы супрацоўнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Валерый ШЫЛАЎ.**

І для гэтага не трэба ператварацца ў маркотнага зануду, які адмаўляецца пакаштаваць фірменны салацік гаспадыні. Дастаткова проста выконваць нескладаныя правілы.

Правіла першае. Рэжым харчавання

Цэлы дзень 31 снежня «назапашваць» голад перад застоллем — так сабе рашэнне. Сняданак, абед і — увага — вячэра! — павінны прысутнічаць у вашым раскладзе на апошні дзень года, як і ў любы іншы дзень. Тады да моманту, калі сям'я збярэцца за святочным сталом, вы не будзеце гатовыя праглынуць, не разбіраючы, усё, што на ім пастаўлена.

— Не варта садзіцца за святочны стол на галодны страўнік. Каб пазбегнуць пераядання, за 30 хвілін да пачатку застолля можна выпіць шклянку вады ці з'есці порцыю лёгкай салаты з агародніны.

Пра тое, што апошні прыём ежы для яе правільнага пераварвання і засваення павінен быць за 2-3 гадзіны да сну, сёння, напэўна, ведае кожны. У навагоднюю ноч вы можаце сесці за стол, напрыклад, у 20.00 — так і свята працягнецца даўжэй, і асноўны голад вы задаволіце значна раней, чым адправіцеся спаць, кажа суразмоўнік.

Правіла другое. Сервіроўка стала

— Мабыць, найважнейшае правіла навагодняй ночы — не есці, а дэгуставаць, — распавядае Валерый Шылаў.

Дапамагчы ў гэтым свайім гасцям можа гаспадыня, аддаўшы перавагу сучаснай сервіроўцы стала. Прыгожы посуд невялікага аб'ёму, менажніцы, парцыённая падача салаты ў бакалах, піялах, «ядомым» посудзе (кошыках з тонкага цеста), дэсертаў — на кавалачках агародніны і садавіны, каўбас і сыроў — на шпажках. Так, як накрываюць стол спецыялісты кейтэрынгу. «Тазікі» салаты — гэта мінулае стагоддзе, да таго ж такая падача правакуе пераяданне і праблемы са страўнікава-кішачным трактам і лішняй вагой. Ды і, у рэшце рэшт, сучасная сервіроўка стала — гэта проста прыгожа і стыльна.

І яшчэ адна парада. Не трэба гатаваць «з запасам». Салаты, што змянілі смак, і засохлая мясная нарэзка, якія пакутліва даядаюцца ўсёй сям'ёй тыдзень, — зусім не карысныя.

Правіла трэцяе. Альтэрнатыва

У чалавека павінна быць права выбару. Але звычайна ў навагоднім меню выбару няма.

— Традыцыйныя навагоднія стравы вельмі каларыйныя. Часта людзі пераядаюць за святочным сталом, таму што на стале проста няма некаларыйных страў. Няхай не ўсе стравы на вашым стале будуць цяжкія. Дадайце агароднінныя і фруктовыя салаты, дзе замест маянэзу ў якасці запраўкі выкарыстоўваюцца лімонны або гранатавы сок, натуральны ёгурт. Пастаўце на стол рыбу і морапрадукты, — раіць спецыяліст.

Ну, а калі вы запрошаны ў госці — дапамажыце сабе самі. Захапіце з сабой, акрамя падарункаў, некалькі не вельмі каларыйных, але смачных страў уласнага прыгатавання. Так, па-першае, вы прыйдзеце ў дом не з пустымі рукамі, а па-другое, забяспечыце сабе і сябрам здаровую альтэрнатыву «Аліўе» і селядцу «пад футрам». І не забудзьцеся паставіць на стол чыстую пітную ваду без газу. Калі вы будзеце піць дастаткова вады за навагоднім сталом, гэта паменшыць апетыт. Дарэчы, у суткі неабходна 30 мл на кілаграм вагі. І гэта не лічачы іншых напояў і супу.

Правіла чацвёртае. Парадак страў

Не есці ўсё, да чаго дацягнуўся, а выконваць парадак ужывання страў нават за навагоднім сталом — залог таго, што вам не прыйдзецца актыўна худзець у сярэдзіне студзеня. І паспрабуйце есці павольна: за сталом сядзець доўга.

— Пачніце з агароднінай салаты, запраўленай раслінным алеем, — раіць Валерый Вікенцевіч. — Агародніна злёгку задаволіць апетыт і дапаможа стравацца. Аддайце перавагу бялку, а не вугляводам. Гэта могуць быць запечанае мяса або, напрыклад, тарталеткі з ікрой. У ідэале ваша трапеза павінна складацца напалову з агародніны і на другую палову — з бялкоў і вугляводаў.

Не варта змешваць несумяшчальныя прадукты, напрыклад:

✓ Не трэба есці садавіну і салодкае адразу пасля тлустага і смажанага. Гэта прамы шлях да дыярэі.

✓ Адмоўцеся ад салодкай газіроўкі. Для маленькіх удзельнікаў навагодняга застолля змяшайце фруктовы сок (пажадана свежавыціснуты) з мінералкай.

✓ Безалкагольныя напоі выбірайце несалодкія: морсы, сокі, тую ж мінеральную ваду (лепш — без газу). А для «салодкага стала» лепш за ўсё падыходзіць моцны чорны чай з лімонам.

Правіла пятае. Разумны падыход да алкаголю

Піць «за здароўе», каб раніцай адчуваць сябе вельмі нездаровым, не варта. Але цяжкага пахмелля можна пазбегнуць.

— Перш за ўсё алкаголь піце толькі пасля тостаў. Запіваць ім ежу — неразумнае рашэнне. Алкагольныя напоі вельмі каларыйныя, асабліва калі яны салодкія. А яшчэ алкаголь павышае апетыт — з ім вы з'ясце больш, чым без яго.

Кактэйлі, салодкае віно, настойкі і лікёры за навагоднім сталом забяспечаць вам пераяданне, не кажучы ўжо аб цяжкім пахмеллі. Лепш ужываць белае і чырвонае сухое віно. Шампанскае хай будзе брут, сухое або паўсухое.

✓ Недапушчальна змешваць» вінаградны і збожжавы алкаголь. Як і вінаградныя і трысняговыя алкагольныя напоі (ром, тэкіла і г. д.). Вы атрымаеце моцную інтаксікацыю.

✓ Не запівайце моцны алкаголь салодкай газіроўкай. Яны несумяшчальныя. Як, дарэчы, і алкаголь з шакаладам. Гэта бомба для вашага страўніка і падстраўнікавай залозы.

✓ Зусім несумяшчальныя каньяк і бананы. А таксама любы алкаголь з дыняй.

✓ Ідзяце ў госці? Абавязкова паешце дома: хутчэй за ўсё вам літаральна з парога нальюць келіх. А алкаголь на галодны страўнік прывядзіць да хуткага ап'янення.

Правіла шостае. Рух

Не сядзіце ўсю ноч за сталом. Танцуйце, гуляйце ў гульні і ўдзельнічайце ў конкурсах. Адпраўляйцеся на прагулку, ідзіце ў парк ці на каток. У гэтым годзе многія будуць сустракаць Новы год за горадам, на дачах, на базах адпачынку і ў фармаце катэджа, які здымаецца на кампанію. Так пагуляйце на прыродзе! Гэта дадасць святочнага настрою, даставіць незабыўныя эмоцыі і зробіць свята непадобным на ўсе астатнія.

Правіла сёмае, паслясвяточнае. Не карайце сябе дыетай

З 1 студзеня прынята пачынаць новае жыццё. Але не спяшайцеся садзіцца на дыету з першымі прамянямі сонца 2021 года.

— Разгрузачныя дні раней за 3 студзеня стануць стрэсам для арганізма. А пераяданне ў навагоднія дні і так было велізарнай нагрузкай. Дайце сваёй стрававальнай сістэме час, каб нармалізаваць работу. Дарэчы, і нізкакаларыйныя дыеты ў снежні, «каб пахудзець да Новага года», я раю завяршыць не пазней чым за тыдзень да навагодняй ночы.

А каб пазбавіцца лішняй вагі пасля навагодніх і калядных «празмернасцяў», неабходна проста збалансаванае харчаванне, а не жорсткія дыеты. Дарэчы, мужчыны паўнеюць у Новы год менш, чым жанчыны. У жанчын павышаны апетыт у святочныя дні звязаны з ваганнямі цукру ў крыві. Таму іх цягне на салодкае. У мужчын метабалізм больш стабільны. Але і моцнай палове варта выконваць вышэйпералічаныя правілы застолля.

Святочныя лайфхакі ад дыетолагаў

Не забудзьцеся паставіць на навагодні стол:

✓ Чыстую ваду без газу.

✓ Свежую буйна нарэзаную гародніну. Яна выдатна спалучаецца з мясам і дапамагае хутчэй адчуць насычэнне.

✓ Лёгкія закускі. Соусы да іх падайце асобна — гэта, як правіла, самы каларыйны інгрэдыент многіх страў.

✓ Хлеб — цэльназерневы, і толькі з жытняй мукі.

Падчас гатавання мяса выкарыстоўвайце посуд з антыпрыгарным пакрыццём — так вам не спатрэбіцца шмат алею.

Усюды, дзе толькі можна, замяняйце маянэз на нізкакаларыйныя соусы — іх лёгка прыгатаваць з дапамогай блэндара. Вось некалькі простых рэцэптаў:

Тар-тар: ёгурт + карнішоны + кроп + часнок + спецыі.

Грыбны: смажаныя шампіньёны + цыбуля + спецыі + ёгурт.

Таматавы: памідоры + кінза + зялёная цыбуля + кроп + часнок + спецыі.

Кары: ёгурт + яечныя жаўткі + цыбуля + прыправа «Кары».

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

20 января 2021 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке, руб.	Примечание
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Деревни Старина, уч. 5А	0,1499	625680202201000309	14 500,00	1 337,31 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Кашканы, ул. Кашкановская, уч. 1А	0,2500	625683804101000009	7 000,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к электроснабжению
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Колодино, ул. Колодинская, уч. 23	0,1500	625680206401000041	5 000,00	76,50 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к электроснабжению
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Рябиновка, ул. Центральная, уч. 12А	0,1148	625680211801000076	6 500,00	86,40 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению
Лот № 5	Дещенский сельисполком	д. Слободка, ул. Трудовая, уч. 17Б	0,1499	625680212501000056	5 500,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **15 января 2021 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенный банком документ об оплате задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

